Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”
Кафедра беларускага мовазнаўства

С.В. Мартынкевіч

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

Метадычныя рэкамендацыі

Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2021

Репозиторий ВГУ

УДК 811.161.3:821.161.3(075.8)
ББК 81.411.3я73+83.3(4Беи)я73
М29

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 3 ад 23.12.2020.

Аўтар: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат педагагічных навук, дацэнт **С.В. Мартынкевіч**

Р э ц э н з е н т :
дацэнт кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат філалагічных навук *Л.Я. Глазман*

Мартынкевіч, С.В.
М29 Беларуская мова і літаратура : метадычныя рэкамендацыі / С.В. Мартынкевіч. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. – 60 с.

Метадычныя рэкамендацыі па дысцыпліне “Беларуская мова і літаратура” для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 04-02 Руская мова і літаратура. Замежная мова акрэсліваюць напрамкі вучэбнай дзейнасці пры падрыхтоўцы да заняткаў, змяшчаюць рэкамендацыі і практычныя заданні па тэмах курса, садзейнічаюць самастойнаму асэнсаванню сутнасці моўных і літаратурных працэсаў. У выданні прапанаваны дадатковыя матэрыялы для кіруемай самастойнай работы студэнтаў і спісы літаратуры па кожнай тэме.

Прызначаецца студэнтам філалагічных спецыяльнасцей.

УДК 811.161.3:821.161.3(075.8)
ББК 81.411.3я73+83.3(4Беи)я73

© Мартынкевіч С.В., 2021
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021

Рэпозиторий ВГУ

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА …… 4
Патрабаванні да кампетэнцый студэнтаў …….. 6
Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны ….. 7
Структура зместу вучэбнай дысцыпліны …… 8
ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ ……..... 9
ЗМЕСТ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ …….. 14
МОДУЛЬ 1 Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей …….. 14
МОДУЛЬ 2 Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы …….. 24
МОДУЛЬ 3 Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму 33
МОДУЛЬ 4 Культура беларускага маўлення …….. 39
МОДУЛЬ 5 Нацыянальна-культурная спецыфіка мовы мастацкага тэксту …… 47
ЗАДАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ …… 53
Тэмы рэфератаў …….. 53
Практыкаванні для самастойнай працы …… 53
Тэст …… 58

Репозиторий ВГУ

ПРАДМОВА

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, у нашай краіне дзяржаўны статус маюць дзве мовы – беларуская і руская. Канцэпцыя моўнай адукацыі паставіла задачу – перайсці ад “змешанага тыпу індывідуальнага двухмоўя да фарміравання двухмоўя нарматыўнага, адносна чытача, дзе ў ролі дамінантнага механізма выступае родная мова”. Абавязак кожнага адукаванага беларуса – ведаць беларускую мову як дзяржаўную мову і мову тытульнай нацыі, падтрымліваць яе ў сферы камунікацыі.

Сучасная канцэпцыя падрыхтоўкі спецыялістаў заснавана на сусветнай гуманістычнай тэндэнцыі захавання і развіцця нацыянальна-культурнай самабытнасці народаў, найважнейшым элементам якой выступае нацыянальная мова. Мэта гуманітарнай, у прыватнасці, беларускамоўнай адукацыі студэнтаў – не толькі паглыбіць іх веды па беларускай мове і літаратуры, але і пазнаёміць з асаблівасцямі развіцця беларускай мовы, яе нацыянальна-культурнай спецыфікай, асаблівасцямі функцыянавання ў сучасным грамадстве, а таксама выпрацаваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці беларускай мастацкай літаратуры; фарміраваць цікавасць да духоўнай і культурнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай годнасці.

Мэта дысцыпліны “Беларуская мова і літаратура” – фарміраваць прафесійныя кампетэнцыі, якія дазваляюць эфектыўна рэалізоўваць навучальную, выхаваўчую, развіццёвую, каштоўнасна-арыентацыйную дзейнасць; педагагічныя кампетэнцыі, якія дазваляюць арганізаваць цэласны педагагічны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый; філалагічную культуру асобы як сукупнасць ведаў, навыкаў і ўменняў, прафесійна-значныя якасці, здольнасці да самарэгуляцыі і канструктыўнага ўзаемадзеяння.

Задачы дысцыпліны:

• актуалізаваць, сістэматызаваць і паглыбіць веды студэнтаў па беларускай мове і літаратуры, атрыманыя ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;

• замацаваць правільнасць выкарыстання на практыцы арфаэпічных, акцэнталагічных, лексічных, словаўтваральных і граматычных нормаў беларускай літаратурнай мовы;

• выпрацоўваць культуру маўлення, навыкі свабоднага валодання і карыстання беларускай мовай у розных сферах камунікацыі, уменне бачыць, выпраўляць і аналізаваць моўныя памылкі;

• развіваць моўную чуйнасць, вучыць адчуваць прыгажосць беларускага слова ў мастацкім кантэксце;

Репозиторий ВГУ

• фарміраваць навыкі самастойнай працы з навуковай літаратурай, слоўнікамі, даведнікамі, справаводнымі дакументамі;

• раскрыць заканамернасці функцыянавання і тэндэнцыі развіцця беларускай літаратуры, паказаць яе сувязь з грамадскім і культурным жыццём ад старажытнасці да нашага часу;

• раскрыць ідэйна-мастацкія асаблівасці і нацыянальную спецыфіку беларускай літаратуры на прыкладзе хрэстаматыйных твораў;

• выпрацаваць канцэптуальны навуковы падыход у асэнсаванні беларускай літаратуры;

• дапамагчы студэнтам усвядоміць месца беларускай мовы і літаратуры ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі;

• выхоўваць любоў і павагу да беларускага мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі;

• развіваць літаратурна-творчыя здольнасці студэнтаў; стымуляваць іх цікавасць да самастойнай даследчай дзейнасці; фарміраваць уменні і навыкі стварэння ўласных навукова-даследчых прац (рэфератаў, дакладаў, даследчых праектаў);

• фарміраваць устаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

• замацаваць веданне нормаў беларускай літаратурнай мовы, садзейнічаць фарміраванню маўленчай культуры і пісьменнасці;

• пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі этапамі развіцця нацыянальнай мовы і літаратуры і паказаць іх месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, развіваць цікавасць да лепшых узораў беларускага мастацкага слова, раскрыць спецыфіку канцэптасферы беларускай літаратуры як сродку спасціжэння ментальнасці народа;

• садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных і творчых спецыялістаў-філолагаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы і развіцця літаратуры ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму і глабалізацыі культуры ў сучасным свеце.

Вывучэнне дысцыпліны “Беларуская мова і літаратура” скіравана на пашырэнне кругагляду, станаўленне асобы і фарміраванне светапогляду, развіццё інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры, што звязана з эфектыўнасцю будучай прафесійнай дзейнасці спецыялістаў-філолагаў.

Дысцыпліна цесна звязана з такімі дысцыплінамі, як “Гісторыя беларускай мовы”, “Культура вуснага і пісьмовага маўлення”, “Стылістыка”, “Этналінгвістыка”, “Лінгвакультуралогія”, “Гісторыя беларускай літаратуры”.

Репозиторий ВГУ

Змест курса “Беларуская мова і літаратура” арыентуе студэнтаў на:

– веданне нормаў беларускай літаратурнай мовы, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, асэнсаванне асаблівасцей беларускай мовы; фарміраванне ўменняў практычнага выкарыстання мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (*моўная кампетэнцыя*);

– усведамленне мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, як сродку спасціжэння айчыннай і сусветнай культуры, выпрацоўка ўменняў карыстацца культуразнаўчымі звесткамі з мэтай забеспячэння паўнавартаснай камунікацыі;

– сістэматызацыю ведаў пра літаратуру як цэласнасць, прадстаўленую ў выглядзе паняццяў і спосабаў дзейнасці *(літаратурная кампетэнцыя)*, узбагачэнне ўяўленняў пра літаратуру як пра сацыякультурны феномен *(культуралагічная кампетэнцыя)*, выпрацоўку ўменняў і навыкаў рэпрэзентацыі вынікаў даследчай дзейнасці *(камунікатыўная кампетэнцыя)*;

– далучэнне да набыткаў айчыннай мастацкай славеснасці, развіццё здольнасці да эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі з’яў літаратуры, яе этнакультурнага зместу; фарміраванне навыкаў самастойнага чытання, мастацка-эстэтычнага густу.

Патрабаванні да кампетэнцый студэнтаў

Патрабаванні да **акадэмічных кампетэнцый** студэнтаў:

АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Патрабаванні да **прафесійных кампетэнцый** спецыяліста

навучальная дзейнасць:

ПК-1. Эфектыўна рэалізоўваць навучальную дзейнасць.

ПК-2. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-3. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы, сродкі навучання.

ПК-4. Ажыццяўляць аптымальны адбор і эфектыўна рэалізоўваць тэхналогіі выхавання.

развіваючая дзейнасць:

Репозиторий ВГУ

ПК-18. Ажыццяўляць прафілактыку дэвіянтных паводзін падлеткаў.

Патрабаванні да **сацыяльна-асобасных кампетэнцый** спецыяліста (СЛК-1, 8):

СЛК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

СЛК-8. Быць здольным да рэалізацыі каштоўнасна-арыентацыйнай дзейнасці.

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны:

валодаць:

– ведамі пра месца і ролю мовы і літаратуры ў грамадстве і культуры, у сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў;

– арфаэпічнымі, лексічнымі, граматычнымі, стылістычнымі і іншымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асноўнымі моўнымі ўніверсаліямі і спецыфічнымі паняццямі беларускай мовы і літаратуры;

– навыкамі лінгвакультуралагічнага аналізу мастацкага тэксту;

ведаць:

– паходжанне і гістарычнае развіццё беларускай літаратурнай мовы;

– адметныя асаблівасці беларускай мовы на яе розных узроўнях;

– асноўныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– спецыфіку лексічнага складу беларускай мовы, яго характарыстыку паводле сферы выкарыстання, нацыянальна-культурнай адметнасці лексічных, фразеалагічных і парэміялагічных адзінак;

– асноўныя сацыялінгвістычныя фактары развіцця беларускай мовы;

– найноўшыя навуковыя дасягненні ў галіне беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства;

– найбольш значныя літаратурныя помнікі старабеларускага і новабеларускага пісьменства і іх моўныя асаблівасці;

– асноўныя этапы фарміравання беларускай нацыянальнай ідэі ў літаратуры XIX–XX стст.;

–праблематыку, ідэйны змест і вобразна-выяўленчыя сродкі хрэстаматыйных мастацкіх твораў;

– нацыянальна-культурныя адметнасці мовы прэцэдэнтных беларускіх мастацкіх тэкстаў, створаных у розныя перыяды развіцця беларускай літаратуры;

– рэпрэзентаваныя ў беларускай мастацкай літаратуры асноўныя канцэпты як сродкі спасціжэння нацыянальнай культуры, нацыянальнага характару і ментальнасці беларускага народа;

умець:

– прымяняць асноўныя нормы беларускай літаратурнай мовы на практыцы;

Репозиторий ВГУ

– працаваць з беларускамоўнымі тэкстамі і раскрываць нацыянальна-культурную семантыку моўных адзінак, ужытых у мастацкім творы;

– ажыццяўляць камунікацыю на беларускай мове;

– выкарыстоўваць навуковыя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных праблем; дыялектычна мысліць, аргументаваць свой пункт гледжання, аналізаваць моўныя і літаратурныя факты;

– выяўляць аб'ектыўныя заканамернасці і асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу;

– аналізаваць мастацкія творы з улікам іх ідэйна-мастацкай цэласнасці і нацыянальна-культурнай адметнасці;

– выкарыстоўваць метады лінгвакультуралагічнага і кагнітыўнага аналізу моўных адзінак у кантэксце мастацкіх твораў, укараняць інавацыйныя падыходы пры іх аналізе;

– працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай;

– фарміраваць і вырашаць задачы, якія ўзнікаюць у час навукова-даследчай дзейнасці.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

Вывучэнне раздзела “Беларуская мова і літаратура” ўключае лекцыйны курс і практычны змест.

У аснову структурыравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай дысцыпліны пакладзены прынцып модульнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя модулі (тэмы).

Па кожным вучэбным модулі (тэме), у адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый, праектуюцца і рэалізуюцца канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі, у тым *ліку тэхналогія праблемнага навучання, тэхналогія праектнай дзейнасці, афлайн-тэхналогія,* заснаваная на забеспячэнні студэнтаў інфармацыйнымі адукацыйнымі рэсурсамі ў выглядзе вучэбна-метадычных матэрыялаў для самастойнай працы з выкарыстаннем розных відаў носьбітаў інфармацыі, у тым ліку і электронных у віртуальным навучальным асяроддзі “Moodle”.

Репозиторий ВГУ

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны ў дысцыпліну “Беларуская мова і літаратура”

Прадмет і задачы курса. Месца курса ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук, яго сувязь з іншымі дысцыплінамі (гісторыяй літаратурнай мовы, лексікалогіяй, стылістыкай і культурай маўлення). Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.

Модуль 1. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

Сутнасць і прырода мовы. Гіпотэзы паходжання мовы. Мова і соцыум. Мова як сродак камунікацыі. Функцыі мовы ў грамадстве. Этнічная функцыя мовы. Мова як кампанент нацыянальнай самасвядомасці. Менталітэт і родная мова.

Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў. Мова як крыніца ведаў пра нацыянальную культуру народа. Нацыянальныя традыцыі ў моўнай намінацыі і маўленчым этыкеце. Мова як галоўны паказчык этнічнай самасвядомасці, аснова гарманічнага фарміравання маўленчай асобы. Творчы патэнцыял мовы.

Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця. Старабеларуская літаратурная мова XIV – XVI ст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім. Асоба Францыска Скарыны і яго роля ў літаратуры. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі. Новая (сучасная) беларуская мова XIX – пачатку XX ст. Узбагачэнне слоўніка і фразеалогіі беларускай літаратурнай мовы ў пачатку XX ст., выкліканае развіццём грамадска-палітычных адносін, тэхнікі і мастацтва, пашырэнне друкаванага беларускага слова. Графічныя і граматычна-правапісныя асаблівасці беларускіх выданняў пачатку XX ст. Няўстойлівасць граматычных нормаў беларускай літаратурнай мовы, адсутнасць адзінай агульнапрынятай і абавязковай арфаграфіі. Беларуская літаратурная мова ў часы Расійскай імперыі ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці.

Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX–пачатку XXIст. Дынаміка нармавання беларускай літаратурнай мовы ў XX – пач.XXI ст.ст. Мова і культура беларусаў творах беларускіх пісьменнікаў (В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч (Цётка), М. Багдановіч, М. Гарэцкі, К. Чорны, У. Дубоўка, К. Крапіва, Я. Брыль, Я. Скрыган, В. Быкаў, Н. Гілевіч, Р. Барадулін і інш.). Беларусізацыя. Узрастанне ролі беларускай літаратурнай мовы як найважнейшага сродку будаўніцтва нацыянальнай культуры беларускага народа. Далейшае развіццё і ўдасканаленне стыляў мастацкай літаратуры

Репозиторий ВГУ

і публіцыстыкі беларускай літаратурнай мовы. Кадыфікацыя граматычных нормаў і стварэнне адзінага дзяржаўнага правапісу. Погляды Я. Купалы і Я. Коласа на мастацкае слова, на ролю беларускай літаратурнай мовы ў нацыянальна-культурным развіцці. Народныя вытокі мовы Я. Купалы і Я. Коласа, багацце моўна-выяўленчых сродкаў іх твораў. Узбагачэнне імі слоўніка, фразеалогіі і стылістычных сродкаў беларускай літаратурнай мовы. Роля Я. Коласа ў развіцці стылю мастацкай прозы.

"Закон аб мовах у Рэпубліцы Беларусь".

Модуль 2. Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы

Слоўнікавае багацце беларускай мовы. Беларуская лексіка паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная). Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання (агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання).

Лексічнае значэнне слова. Спецыфіка спосабаў намінацыі ў мове. Лексічная спалучальнасць. Безэквівалентная лексіка. Нацыянальна-культурная спецыфіка беларускіх антрапонімаў.

Фразеалагізмы і іх ужыванне ў мове. Крыніцы беларускай фразеалогіі. Класіфікацыя фразеалагічных зваротаў паводле паходжання (уласнабеларускія, запазычаныя, калькі).

Фразеалагічныя звароты, запазычаныя са славянскіх моў.

Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў.

Прыказкі. Прымаўкі. Крылатыя словы. Афарызмы.

Вусная народная творчасць як крыніца вывучэння традыцыйнай народнай культуры. Этнакультурная адметнасць мовы вуснай народнай творчасці беларусаў.

Лексікаграфія. Тыпы слоўнікаў. Тлумачальныя слоўнікі. Перакладныя слоўнікі. Слоўнікі сінонімаў, паронімаў, фразеалагізмаў, прыказак і прымавак, дыялектнай лексікі і інш. Моўнае багацце і слоўнікі.

Модуль 3. Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму

Сучасныя праблемы моўнага жыцця і этнічнай самасвядомасці насельніцтва Беларусі. Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі Паняцце моўнай нормы.

Фанетыка. Аспекты вывучэння гукаў. Фанетычныя асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай.

Арфаэпія. Фарміраванне беларускага літаратурнага вымаўлення. Асноўныя нормы беларускага літаратурнга вымаўлення. і прычыны іх парушэння. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім.

Графіка. Пісьмо ў гісторыя развіцця чалавецтва. З гісторыі беларускай графікі. Лацініца і кірыліца.

Репозиторий ВГУ

Арфаграфія. Прынцыпы беларускай арфаграфіі. Арфаграфічныя нормы.

Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Назоўнік. Разыходжанне ў родзе і ліку назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Прыметнік. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Выкарыстанне элятыўных формаў у беларускай і рускай мовах. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне. Займеннік. Асаблівасці ўжывання асабовых, азначальных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. Лічэбнік. Скланенне лічэбнікаў і асаблівасці іх ужывання з назоўнікамі. Дзеяслоў. Спецыфіка спражэння. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова. Асаблівасці іх утварэння і ўжывання ў беларускай мове. Спосабы перадачы дзеепрыметнікаў пры перакладзе на беларускую мову. Прыслоўе. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання формаў ступеней параўнання ў адрозненне ад рускай мовы.

Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адрозненні ў будове некаторых словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах. Сінтаксічныя нормы беларускай мовы.

Стылістыка. Функцыянальныя стылі, іх асаблівасці. Сферы выкарыстання кожнага з іх. Стылістычны аналіз тэксту. Тыпы маўлення.

Модуль 4. Культура беларускага маўлення

Спецыфіка маўленчай дзейнасці. **Культура мовы** – спецыфічныя асаблівасці, разнастайныя сродкі нацыянальнай мовы, выпрацаваныя ў працэсе яе функцыянавання ў грамадстве ў адпаведнасці з узроўнем грамадскага развіцця. Культура маўлення – сукупнасць і сістэма ведаў, навыкаў, якія забяспечваюць аптымальнае прымяненне мовы ў канкрэтны момант. Прагматычны аспект стылістыкі і маўлення: культура маўленчых зносін, прамоўніцкае майстэрства, агульная культура асобы.

Камунікатыўныя якасці маўлення як тыпалагічныя прыметы правільнай мовы. Сувязь маўлення з моўнымі і пазамоўнымі структурамі і яе рэалізацыя ў канкрэтных камунікацыйных якасцях. Багацце маўлення (гукавое, лексічнае, фразеалагічнае, сінтаксічнае) у літаратурных творах Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Івана Мележа, Янкі Брыля, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Алеся Разанава і іншых беларускіх пісьменнікаў. Выкарыстанне моўных сродкаў у эстэтычнай функцыі. Выяўленчыя сродкі мовы. Эпітэт, параўнанне, метафара, алегорыя, увасабленне. **Маўленчы этыкет.** Нацыянальна-культурная спецыфіка маўленчага этыкету. Гісторыя і сучаснасць беларускага маўленчага этыкету.

Репозиторий ВГУ

Модуль 5. Нацыянальна-культурная спецыфіка мовы мастацкага тэксту

Мова мастацкага твора як сродак спасціжэння нацыянальнай літаратуры. Асаблівасці мастацкай мовы. Мастацкі тэкст як фактар нацыянальнага. Мова і нацыянальная прыналежнасць мастацкага твора.

Мастацкія тэксты як рэпрэзентанты нацыянальнай культуры пэўнага народа, яго карціны свету, сістэмы вобразных сродкаў, вербальных адзнак і нацыянальнай ідыяматыкі. Рэалізацыя ў мастацкім тэксце прынцыпу ўліку мовы і культуры, змяшчэнне інфармацыі, якая садзейнічае пазнанню нацыянальна-культурных адметнасцей і краіназнаўчых рэалій.

Нацыянальна-культурная спецыфіка беларускага мастацкага тэксту. Адлюстраванне ў беларускай літаратуры асаблівасцей нацыянальнага светапогляду і менталітэту беларусаў як нацыі. Моўныя адзінкі ў мастацкім тэксце, якія ўтрымліваюць этнакультурную інфармацыю.

Мова як фактар існавання беларускай нацыі: рэпрэзентацыя канцэпту ў мастацкай літаратуры. Сувязь мовы і духоўнага жыцця народа. Асноўныя паняццевыя кампаненты мастацкага канцэпту *мова* – ‘любоў да роднай мовы’, ‘прыгажосць роднай мовы’(Я. Янішчыц “Мова” , П. Макаль “Роднае слова”, М. Танк “З легендаў і казак былых пакаленняў…”). Мова – асноўная прыкмета этнасу, звяно, якое звязвае людзей у адзіны народ (Цётка “Шануйце роднае слова”, Н. Гілевіч “Адкажы”, творы Р. Барадуліна). Мова як прыкмета дзяржаўнасці. Захаванне мовы – умова існавання нацыі (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка “Дудка беларуская”, У. Караткевіч “Беларуская песня”, В. Цяпінскі. Прадмова да Евангелля).

Уладзімір Караткевіч (1930–1984)**.** Лінгвакультуралагічны кампанент у творах У. Караткевіча. Нацыянальна-культурная спецыфіка лексікі, фразеалагізмаў, прыказак і прымавак. Асноўная роля прыказак і прымавак у творах У. Караткевіча – характарыстыка духоўнага аблічча дзейных асоб, іх поглядаў на навакольны свет ці пэўныя падзеі.

Этналінгвістычная адметнасць твораў У. Караткевіча. Моўныя элементы з нацыянальна-культурным кампанентам значэння ў яго творах. Безэквівалентная і дыялектная лексіка як носьбіты этнакультурнай інфармацыі ў мастацкім тэксце У. Караткевіча: найменні страў беларускай кухні, прадметаў і з’яў бытавога характару, назвы казачных і міфалагічных персанажаў, народных абрадаў, танцаў і інш. Нацыянальна-культурная адметнасць устарэлай лексікі (архаізмаў, гістарызмаў) у моўнай тканіне караткевічаўскай прозы: грамадска-палітычная і сацыяльна-эканамічная лексіка, назвы зброі, бытавая лексіка. Нацыянальна-культурная спецыфіка анамастычнай лексікі. Фразеалагізмы, народныя выслоўі з нацыянальна-культурным кампанентам значэння.

Васіль Быкаў (1924–2003). Жыццёвы і творчы шлях В. Быкава. Шматпланавасць паказу вайны, зварот да партызанскай тэматыкі.

Репозиторий ВГУ

Пашырэнне тэматычнага дыяпазону творчасці ў 1980–90-я гг. Асэнсаванне падзей нядаўняй гісторыі і сучаснасці (“Знак бяды”, “Аблава”, “Жоўты пясочак”, “На чорных лядах”, “Ваўчыная яма” і інш.). Трагедыйнасць твораў апошніх дзесяцігоддзяў. Зварот пісьменніка да трагічных падзей савецкай гісторыі – Слуцкага паўстання, калектывізацыі, рэпрэсій і інш. (“Бедныя людзі”, “Сцяна”, “Музыка”, “Пакахай мяне, салдацік”), іх жанравая разнастайнасць.

Нацыянальна-культурная спецыфіка мовы арыгінальных твораў В.Быкава. Нацыянальна-маркіраваная лексіка ў быкаўскім арыгінальным тэксце. Найменні прадметаў і з’яў традыцыйнага беларускага побыту. Безэквівалентная лексіка. Фразеалагізмы і трапныя народныя выразы, дзякуючы якім пісьменнік стварае праўдзівую і пераканаўчую карціну жыцця герояў твораў. Ужыванне фразеалагізаваных выказванняў, праклёнаў і пажаданняў як сродкі моўнай характарыстыкі герояў. Размоўная і дыялектная лексіка як сродак стварэння мясцовага каларыту ў аповесцях В.Быкава. Прыказкі і прымаўкі ў мастацкай тканіне быкаўскіх аповесцей. Моўныя адзінкі з нацыянальна-культурным значэннем як сродак адлюстравання звычаяў і вераванняў беларускага сялянства, глыбіняў народнага духу беларусаў, іх культуры і самасвядомасці.

Дыялектызмы, іх роля ў рускамоўных аўтарызаваных перакладах твораў. Формулы беларускага маўленчага этыкету, іх нацыянальна-культурная спецыфіка.

Творчасць Р.Барадуліна (1935–2014) 80–90-х гадоў XX – пачатку XXI ст. “Вушацкі словазбор” Р. Барадуліна (2013) – слоўнік адметнай лексікі, устойлівых выразаў, параўнанняў, прыказак і прымавак з гаворак Вушаччыны. Нацыянальна-культурная адметнасць творчасці. Рэпрэзентацыя асаблівасцей традыцыйнай народнай культуры беларусаў, традыцый і матываў народнай творчасці. Этнакультурны кампанент мовы ў барадулінскім паэтычным радку. Нацыянальна-культурная спецыфіка моўных адзінак у паэзіі Р.Барадуліна. Побытавая лексіка. Безэквівалентныя найменні. Анамастычная лексіка. Колеравая лексіка. Фразеалагічныя і парэміялагічныя адзінкі. Формулы моўнага этыкету.

Выяўленне нацыянальнай адметнасці мовы паэзіі Р. Барадуліна праз сістэму лексічных і фразеалагічных адзінак з этнакультурным кампанентам значэння. Этнакультурная семантыка моўных сродкаў у паэзіі Р. Барадуліна, праз якія рэпрэзентуецца паняцце “Радзіма”. Значэнне паэтычнай спадчыны Р. Барадуліна для для вывучэння нацыянальнай карціны свету беларусаў.

Репозиторий ВГУ

ЗМЕСТ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

Модуль 1
БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЯЕ МЕСЦА Ў СІСТЭМЕ АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

Практычныя заняткі 1
Сутнасць і прырода мовы

Ключавыя паняцці: *прырода і сутнасць мовы; гіпотэзы паходжання мовы; функцыі мовы ў грамадстве.*

Пытанні для абмеркавання

1. Мова і соцыум. Ахарактарызуйце патрэбы чалавека ў вывучэнні мовы.
2. Хто і як стварыў мову? Гіпотэзы паходжання мовы.
3. Функцыі мовы ў грамадстве. Якая функцыя для беларускай мовы з'яўляецца асноўнай?

Заданні

1. Прачытайце выказванні пра мову. Выдзеліце ў іх асноўныя палажэнні. Выпішыце ключавыя сказы. Пра якія функцыі роднай мовы гаворыцца ў кожным тэксце?

1. Кузьма Чорны неаднаразова звяртаў увагу на тое, што фарміраванне літаратурнай мовы павінна ісці з крыніц жывой, сапраўды народнай мовы... Патрабуючы ад маладых пісьменнікаў заўсёды вывучаць сваю мову, прыслухоўвацца да народных гутарак, К. Чорны жадаў аднаго, каб творы пісаліся моваю жывою...

2. А. П. Чэхаў трапна пісаў наконт моўнай неахайнасці: "Па сутнасці для інтэлігентнага чалавека дрэнна гаварыць павінна б лічыцца такою ж непрыстойнасцю, як не ўмець чытаць і пісаць".

3. Падкрэсліваючы ролю мовы ў выхаванні чалавека, Цётка пісала: "Роднае слова! З малых дзён мы чуем цябе з матчыных вуснаў. Ты нам тлумачыш усе дзівы свету ... табе выказваем мы свой дзіцячы жаль, крыўду, жаданне, радасць... "

2. Перакажыце тэкст па-беларуску.

Однажды философ Ксанф, рабом которого был Эзоп, пригласил гостей и попросил Эзопа приготовить обед: в первый день – самый плохой, во второй день – самый лучший. В первый день на первое, второе и третье Эзоп приготовил язык.

– Почему ты подаешь одни языки? – спросили Эзопа.

– Мне приказали приготовить самый худший обед, а что может быть хуже языка? Только потому, что есть язык, мы огорчаем друг друга, бранимся, лжем, обманываем, хитрим, ссоримся. Язык делает людей

Репозиторий ВГУ

врагами, разрушает города, даже целые государства. Он вносит в нашу жизнь горе и зло. Может ли быть что-нибудь хуже языка?

Во второй день Эзоп снова подал языки. Хозяин и гости изумились.

– Мне велели приготовить самый лучший обед, – пояснил Эзоп, – а что для философа может быть лучше языка! При помощи языка изучаются науки и получаются знания, посредством него мы объясняемся друг с другом, решаем различные вопросы, просим, приветствуем, миримся, даем, получаем, выполняем просьбы, вдохновляем друг друга. При помощи языка строятся города, развивается культура. Думаю, что нет ничего лучше языка.

3. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Вызначце, з дапамогай якіх вобразна-выяўленчых сродкаў выражаецца эстэтычная функцыя мовы.

ОКТЯБРЬ

Месяц желтых метелей. Сначала листок за листком тихо валятся к низу. Но вот покрепче мороз – и клен на опушке как будто за ночь остригли. Рыжая прическа ворохом лежит возле ног.

И все кругом теряет листок за листом. В тихий день разлита ме-жду деревьями желтая музыка. Листья кружатся в медленном танце, повисают на паутинках, золотым шитьем ложатся на елки, на темные шары можжевельника и тихие окна лесной воды.

Лесные дороги покрылись желтым ковром. Листья не поблекли и не подсохли еще, глушат шаги, мягкой подстилкой лежат в колее, в сырую погоду липнут на тележное колесо. Листья еще не успели прикрыть грибы, еще можно найти грузди, опенки, россыпи пахучих медных рыжиков. Напоказ стоит ядовитая красота мухоморов.

Дожди. Туман. Белая соль мороза. С каждым днем все гуще огонь листопада. И приходит, наконец, день желтой метели. Закружилось, перепуталось все в лесу *(М. Пришвин).*

4. Зрабіце пісьмовы пераклад тэксту на беларускую мову.

По отношению каждого человека к своему языку можно совершенно точно судить не только о его культурном уровне, но и о его гражданской ценности. Истинная любовь к своей стране немыслима без любви к своему языку. Человек, равнодушный к родному языку – дикарь. Он вредоносен по самой своей сути, потому что его безразличие к языку объясняется полнейшим безразличием к прошлому, настоящему и будущему своего народа (К. Паустовский).

5. Падбярыце выказванні знакамітых людзей пра ролю мовы ў жыцці чалавека.

Літаратура

1. Азарка, В.У. Беларуская мова: спецыяльная лексіка / В.У. Азарка [і інш.] – Мінск, 2005.
2. Лепешаў І.Я. Практыкум па беларускай мове. – Мінск, 2005.

Репозиторий ВГУ

3. Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні. – Гродна, 2002.
4. Мікуліч, Т.М. Мова і этнічная самасвядомасць. – Мінск, 1996.
5. Падлужны, А.І. Мова і грамадства / А.І. Падлужны. – Мінск, 1997.
6. Сямешка, Л.І. Беларуская мова / Л.І. Сямешка. – Мінск, 1999.

Практычныя заняткі 2
Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў

Ключавыя паняцці: *мова тытульнай нацыі, родная мова, моўны знак, намінатыўная функцыя мовы.*

Пытанні для абмеркавання

1. Мова як крыніца ведаў пра нацыянальную культуру народа. Чаму мову называюць крыніцай ведаў пра народ?
2. Мова як галоўны паказчык этнічнай самасвядомасці.
3. Якія нацыянальныя традыцыі адлюстраваны ў беларускай мове?

Заданні

1. Прачытайце урывак з прадмовы Францыска Скарыны. Вызначце асноўную думку. Знайдзіце лексіныя адзінкі, якія выражаюць нацыянальную спецыфіку мовы.

Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знаютъ ямы своя; птици, латающие по возъдуху, ведаютъ гнезда своя; риби, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и им подобная боронять ульев своих, – також и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають…

2. Прааналізуйце творы А. Разанава. З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў аўтар стварае вобразнасць? Знайдзіце словы, якія з'яўляюцца адметнымі для беларускай мовы з пункту гледжання выражэння моўнай намінацыі.

Будзень і свята

Будзень будзіць людзей, нагадваючы ім пра тое, што пачынаецца дзень і што нікуды не дзенешся ад клопатаў і работы; свята чакае, калі чалавек сам абудзіцца, і калі ён абуджаецца, ветліва вітае яго.

Будзень – удзельнік, свята – сведка, будзень – маладзік, свята – ветах, будзень – дзейнік, свята – выказнік, будзень абяцае: усё, што трэба, збудзецца, свята вясткуе: усё, што трэба, збылося.

Будзень – падзея, свята – з'ява, будзень – агледзіны, свята – сватаненне, будзень распачынае, свята вянчае, будзень – жаніх, свята – нявеста, будзень – "нудзень", свята – вяселле.

Будзень – зіма, свята – вясна, будзень – студзень, свята – май, будзень дбае, свята мае, будзень – яда, свята – піта, будзень рупіцца ў пыле і брудзе, свята аздоблена ў саеты.

Репозиторий ВГУ

Будзень ідзе, свята стаіць, будзень дзеліць, свята яднае, будзень бачыць гадзіны, свята – вечнасць, будзень судзіць, свята апраўдвае, на будзень дзівяцца людзі, на свята – свет.

Чарот-вечарот

На возераберазе,
Дзе векамань – каменннем,
Каменне – векаманню.
На берагавозеры
Чарот, вечарот,
На вечараберазе
Веча шумлівае.

3. Перакладзіце словы на беларускую мову.

Белолицый, всеобщий, добросовестный, жизнерадостный, лесозащитный, многолетний, общеизвестный, черноглазый, четырёхэтажный.

4. Ад якой часціны мовы і якім спосабам утвораны прыметнікі? Вызначце адметныя назвы беларускай мовы.

Адзіны, агністы, антырэлігійны, бацькоўскі, белаваты, бульбяны. Вадзяністы, гадавы, віхрасты, ганаровы, гаспадынін, гулкі, дваісты, жыццёвы, імклівы, краўцоў, маўклівы, няўлоўны, пакладзісты, славянскі, урадлівы, шчаслівы, шчупакоў.

5. Перакладзіце тэкст на беларускаую мову.

Неряшливость в одежде – это неуважение к окружающим вас людям и к самому себе. Дело не в том, чтобы быть одетым щегольски. В щегольской одежде есть, может быть, преувеличенное представление о собственной элегантности, и по большей части щеголь стоит на грани смешного. Надо быть одетым чисто и опрятно, в том стиле, который больше всего вам идет, и в зависимости от возраста. Язык в еще большей мере, чем одежда, свидетельствует о вкусе человека, о его отношении к окружающему миру, к себе (*Д. Лихачев*).

6. Якія нацыянальныя традыцыі адлюстраваны ў беларускай мове? Перакажыце тэкст.

Славуты асілак

Даўным-даўно, тысячы гадоў таму, з-пад вялізнага каменя, дзе б'е крыніца, нарадзіўся славуты асілак. Яго назвалі Нёманам. Жыў сярод лясоў дрымучых, лугоў шырокіх, прыгожы, працавіты, прыродзе, і людзям, і ўсяму жывому дабром плаціў. У суседстве жыла Лоша: гультаяватая, ляжала ў цяньку, сабою любавалася, нікому ад яе не было ні радасці, ні карысці. Лоша часта заглядала да свайго суседа. За маўклівасць называла яго Неманцом.

Цяпер ніхто не ведае, што Нёману спадабалася тая красуня. Адно вядома – было вяселле. Гуляла на ім уся жаніхова радня: і Сула, і Уса, і Уздзянка, і Шчара... Каго толькі тут не было! Пілі, балявалі, маладым шчасця ды добрай долі жадалі.

Репозиторий ВГУ

Скончылася вяселле, пачаліся будні.

Зноў Нёман не ведаў ні дня ні ночы. Паіў, карміў, туліў ўсіх, хто да яго гарнуўся: і чалавека, і звера, і птаха, і рыбу, і жыўнасць усякую. Цешыў сваім люстэркам водным прыбярэжныя лясы, палеткі, лугі, на сваіх магутных грудзях насіў чоўны, ганяў плыты.

Не раз запрашаў на шырокі прастор і сваю красуню ненаглядную. Толькі тая была абыякавая, халодная да ўсяго, па-ранейшаму не хацела дзяліць са сваім волатам нягоды і радасці.

Не да душы было такое жыццё Нёману: аднойчы цёмнай ноччу кінуўся ўпрочкі.

Прачнулася Лоша, а Нёмана няма. Пачала даганяць уцекача, ды не ў той бок кінулася. Па далінах ды па нізінах бегла, ажно сіл не ставала, дый не ведала, куды далей падацца. Гукала-клікала на дапамогу, але ніхто не прыйшоў: ні Пціч, ні Бярэзіна, ні Свіслач... Выбегла Лоша да груда пясчанага і ўбачыла: Нёман праз долы і лясы дарогу сабе пракладае. Пачала дапамагаць яму. І людзі не абмінулі яе: паблізу пачалі будавацца. Так нарадзіліся вёскі Лоша, Мрочкі, Пясочнае, Сасноўка, Рачыца.

Нёман ніколі не забывае родныя мясціны. Кожную вясну, кожную восень дажджлівую вяртаецца да маці сваей – крынічкі, якая цячэ з-пад вялікага каменя. *(А.І. Гурскі. Бяздоннае багацце)*

Літаратура

1. Азарка, В.У. Беларуская мова: спецыяльная лексіка / В.У. Азарка [і інш.] – Мінск, 2005.

2. Каўрус, А.А. Слова наша роднае / А.А. Каўрус. – Мінск, 1986.

3. Лыч, Л.М. Беларуская нацыя і мова / Л.М. Лыч. – Мінск, 1994.

4. Мікуліч, Т.М. Мова і этнічная самасвядомасць / Т.М. Мікуліч. – Мінск, 1996.

5. Падлужны, А.І. Мова і грамадства/ А.І. Падлужны. – Мінск, 1997.

6. Сямешка, Л.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996.

Практычныя заняткі 3
Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы

Ключавыя паняцці: *мова, сістэма, дыялектная мова, літаратурная мова, норма, перыядызацыя, праславянская мова, агульнаўсходнеславянская мова, старабеларуская мова, сучасная беларуская літаратурная мова.*

Пытанні для абмеркавання

1. Беларуская мова ў сям'і індаеўрапейскіх моў. Вытокі беларускай мовы.
2. Старабеларуская літаратурная мова XIV–XVI ст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім.
3. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі.

Репозиторий ВГУ

4. Новая (сучасная) беларуская мова XIX – пачатку XX ст. Беларуская літаратурная мова ў часы Расійскай імперыі ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці.

Заданні

1. Падрыхтуйце паведамленне “Асоба Францыска Скарыны і яго роля ў развіцці беларускай мовы і літаратуры”.

2. Пра што ідзе гаворка ва ўрыўку са Статута Вялікага княства Літоўскага? Перакажыце яго па-беларуску.

Уставуем теж: естли бы которая вдова замуж пошла, а напервей, будучы за первшым мужом своим, вено, оправленое от мужа своего, мела, тогды вжо от другого мужа не маеть вена записаного мети. Нижли естли бы тот другий муж ее умер, а дети по собе зоставил, тогды она межы детми своими ровную часть в именью взяти маеть, а на том до живота мешкати. *(Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588).*

3. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падбярыце загаловак. Вызначце стыль і тып. Абгрунтуйце сваю думку.

Белорусская нация образовалась в результате смешения (ас-симиляции) славян с балтами. Первым государственным образованием среди восточнославянских племен было Полоцкое княжество. Оно возникло в конце первого тысячелетия н. э., еще задолго до образования Киевской Руси. Полоцкое княжество сохраняло независимость на протяжении ряда веков, и даже тогда, когда входило в состав Киевской Руси, а позднее – в состав Великого княжества Литовского. Великое княжество Литовское образовалось на территории Белорусии в 1240 г. со столицей в городе Новогрудке в результате мирного слияния древне белорусских и литовских княжеств. Государственным языком в Великом княжестве Литовском был старобелорусский язык вплоть до XVII в. Великое княжество Литовское считалось славянским не только по языку и культуре, но и по преобладанию славянского населения. Белорусский народ создал одно из самых демократических государственных образований в Европе. Он первый вместе с литовцами и украинцами в 1363 г. под Синими Водами нанес поражение татаро-монгольским ордам и на протяжении столетий успешно защищал свою свободу и независимость от завоевателей *(Е. Ширяев)*.

4. Складзіце план тэксту. Вусна перакажыце тэкст па-беларуску.

Деятельность Симеона Полоцкого оказала большое виняние на просвещение молодой России. Он был первым профессиональным писателем и первым в России интеллигентом. Будучи приглашенным в 1664 году в Москву для воспитания детей царя, Симеон Полоцкий занимался одновременно писательской и просветительской деятельностью. Царь Федор Алексеевич под воздействием своего учителя открыл первую в Кремле типографию и отдал ее в полное его распоряжение. Это

Репозиторий ВГУ

позволило С. Полоцкому издать многие свои произведения. За 16 лет пребывания в Москве он оставил 50 тысяч строк писательских и научных трудов. Написанный и изданный им «Псалтырь» был в свое время высоко оценен М.В. Ломоносовым, считавшим его вместе с «Грамматикой» М. Смотрицкого «вратами учености». С. Полоцкий предсказал рождение Петра I, в будущем великого государственного деятеля. Специально для Петра I он подготовил и издал «Букварь», уделял много внимания его воспитанию. По его проекту в 1686 году было открыто первое высшее учебное заведение – Славяно-греко-латинская академия. Он опередил российскую действительность на целый век (Е. Ширяев).

Літаратура

1. Асновы культуры маўлення і стылістыкі. – Мн., 1992. – 255 с.
2. Антанюк, Л.А. Беларуская мова прафесійная лексіка: Курс лекцый / Антанюк Л.А., Плотнікаў Б.А. – 3-е выданне. – Мн., 2005. – 240 с.
3. Беларуская мова. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Марфалогія. – Мн.: Вышэйшая школа. – 1987. – 429 с.
4. Сямешка, Л.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996.

Практычныя заняткі 4
Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI ст.ст.

Ключавыя паняцці: *мова, сістэма, дыялектная мова, літаратурная мова, норма, перыядызацыя, беларусізацыя, сучасная беларуская літаратурная мова.*

Пытанні для абмеркавання

1. Працэс беларусізацыі ў 20-я гады XX ст.
2. Асаблівасці развіцця беларускай літаратурнай мовы на працягу 30–80 гадоў XX ст.
3. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў 90-я гады XX ст.
4. Стан беларускай мовы на сучасным этапе развіцця грамадства.

Заданні

1. Падрыхтуйце паведамленне пра гісторыю ўзнікнення *Міжнароднага дня роднай мовы.*

2. Прачытайце тэкст. Знайдзіце прэцэдэнтныя выразы. На іх аснове складзіце ўласныя выказванні.

Дзівосная іншаземка

Звычайна людзі гавораць: “Бульба – хлебу падмога”. І гэта праўда. Без бульбы нельга ўявіць ні абедзенны, ні святочны стол. Бульбу вараць, пякуць, смажаць, параць, фаршыруюць. А якія смачныя і апетытныя – толькі што з патэльні – дранікі!

Репозиторий ВГУ

Дзікія родзічы бульбы раслі ў Паўднёвай Амерыцы. Адтуль праз акіян, праз тысячы кіламетраў мараплаўцы Хрыстафора Калумба завезлі бульбу ў Еўропу. На нашу зямлю клубні трапілі дзякуючы Пятру І. З цягам часу чалавек ацаніў харчовыя якасці бульбы, назваў яе "другім хлебам". У засушлівыя гады, калі не радзіла жыта, бульба ратавала людзей ад голаду, ад смерці.

Нездарма народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль вельмі слушна сказаў, што "пах бульбы – не проста пах, а водар жыцця" (*Паводле З. Марозава)*.

3. Замяніце выразы адным словам. Са словамі складзіце сказы і запішыце.

1) самы халодны месяц года; 2) поўны (круглы) месяц; 3) час, калі духмяняць ліпы; 3) грыбы, якія растуць пераважна ў барах; 4) вучэбны дапаможнік, які павінен быць заўсёды бліка, пад рукою; 5) гліняны збан з вузкім горлам; 6) месца, дзе стаяць вуллі з пчоламі.

4. Працягніце далей тэкст. Напішыце мініяцюру.

Лета – гэта ціхая паляна ў лесе, уся прагрэтая паўдзённым сонцам…

Лета – гэта водар свежага непаслухмянага сена … . *(Паводле Я. Сіпакова).*

5. Перакладзіце спалучэнні на беларускую мову.

Анютины глазки, картофельные оладьи, подсолнечное масло, гнездо аиста, утомиться в дороге, книжный магазин, зимовье перелётных птиц, божья коровка.

Літаратура

1. Асновы культуры маўлення і стылістыкі. – Мн., 1992. – 255 с.
2. Гіруцкая, Л.А. Беларуская мова(прафесійная лексіка) / Л.А. Гіруцкая. – Мінск, 2005.
3. Лепешаў, І.Я. Практыкум па лексікалогіі і фразеалогіі / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Гродна, 2001.
4. Плотнікаў, Б.А. Беларуская мова ў сістэме славянскіх моў / Б.А. Плотнікаў. – Мінск, 1999.
5. Сямешка, Л.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996.
6. Шакун, Л.М. Карані роднай мовы / Л.М. Шакун. – Мінск, 2001.

Практычныя заняткі 5

Мова і культура беларусаў у творах беларускіх пісьменнікаў

Ключавыя паняцці: *літаратурная мова, сістэма, мастацкі тэкст дыялектная мова, літаратурная мова, норма, беларусізацыя, сучасная беларуская літаратурная мова.*

Пытанні для абмеркавання

1. Мастацкі тэкст як адлюстраванне нацыянальнай культуры.
2. Мова і нацыянальная прыналежнасць мастацкага твора.
3. Нацыянальныя моўныя элементы ў мастацкім перакладзе.

Репозиторий ВГУ

Заданні

1. Паразважайце, што сімвалізуюць вобразы, выкарыстаныя аўтарам у вершы?

Мох і дуб

Спачатку пасяліўся ля камля,
Пасля на дрэва ўзабраўся,
Як да вяршыні самае дабраўся,
Сказаў:
– Цяпер я –
Вышыня.
Магу я дарасці аж да нябёс:
Да самае далёкай зоркі.
Ды Дуб зазаначыў горка:
– Шаноўны Мох,
Я для цябе зрабіў усё, што мог,
Але да зорак і нябёс
Пакуль што сам я не дарос. *Я. Крупенька*

2. Пра якія каштоўнасці нацыянальнай культуры распавядаюць майсты беларускага слова – Якуб Колас і Генадзь Бураўкін?

1. Справядлівасць – гэта мера, якой трэба адмерваць людзям так, як яны таго заслужылі. 2. Часамі і дзерава не сцерпіць і скіне галіну, каб прыбіць чалавека. На свеце ёсць мера ўсяму. 3. Праўда, гэта, брат, тое, у што ты веруеш так, што і другіх прымусіш паверыць. 4. Да кожнай з'явы на свеце трэба падыходзіць са словамі: чаму? і чаго? Бо гэта і ёсць пачатак мудрасці і філасофіі. 5. Ласка і гнеў, ціша і бура! Я вітаю вас, калі вы прыходзіце ў сваім часе. 6. Ніякага глупства, ніякага свінства з боку чалавека, што дапускае ён у адносінах да іншых, жыццё не даруе. 7. Няма на свеце такое сілы, над каторай не было б большае сілы. 8. Уяўленне аб рэчаіснасці і сама рэчаіснасць – розныя рэчы *(Якуб Колас).*

Наша песня

Не была ты ніколі пры знаці,
Не стаяла ў чарзе да стала,
Не прасілася слёзна «Прызнайце» –
Проста з людам тутэйшым жыла.
Лёс ягоны цярпліва дзяліла,
Не падсмейвалася з-за вугла,
Галасіла на ранніх магілах,
Гулкі рэй па вяселлях вяла.
Не прымала маны і прылукі,
Не сцірала загару са шчок
І хавала сялянскія рукі
Пад сатканы самой хвартушок.
Засталася спагаднай і годнай,

Репозиторий ВГУ

Разбудзіла маўклівы абшар,
Некрыклівая споведзь народа,
Васільковага краю душа *(Генадзь Бураўкін)*

3. Што сведчыць пра нацыянальную прыналежнасць мастацкіх твораў? Апішыце культурныя коды, якія можна скласці на аснове зместу тэкстаў.

Свет матулі. Ён бясконцы, ён таямнічы сваёй прадоннай неабдымнасцю, ён з намі да апошняга ўздыху, наша свядомасць, наша радасць і туга, наша спадчына. Ты вырас, ты самастойны, як здаецца табе. Колькі ўрачоў ні будуць абслухваць цябе, а ніхто з іх, ніводзін з іх з такой дакладнасцю не вызначыць ні тэмпературы тваёй, ні пульсу твайго, ні біцця сэрца, што ўпершыню ўзварухнулася пад матчыным сэрцам, як маці твая зробіць гэта ў імгненне, толькі прыклаўшы руку сваю да твайго лба, толькі вуха прытуліўшы да грудзей тваіх.

Універсітэты і акадэміі будуць вучыць цябе роднай мове, але калі не ўспрыняў мову гэтую з матчыных вуснаў, з першакрыніцы, ніколі ты адчуваць не будзеш слова, дзе гук кожны ад матулі. Мова родная таму і завецца матчынай *(Рыгор Барадулін).*

Яго Вялікасць Хлеб

Хлеб у хаце беларуса – гаспадар, у працы – сябра, а ў дарозе – таварыш.

Ён галоўны на нашым стале. Беларусы заўсёды ставіліся да хлеба з вялікай павагай і пашанай – як да Бога.

Для беларусаў вялікім грахом лічылася скідваць на падлогу хлебныя крошкі. Мы іх акуратненька збіралі ў жменю, елі самі ці аддавалі птушкам.

У Старажытным Егіпце сонца, золата і хлеб абазначаліся адным значком – кружочкам з кропкаю ў ім. Разумееце, сонца, золата і хлеб. Усё самае важнае. І ў нас гэтак лічылася. Толькі парадак быў крыху іншы: хлеб, сонца, золата. Бо жыта і жыццё маюць у беларусаў адзін і той жа корань.

У беларусаў быў культ зерня, і людзі пакланяліся яму. Мы заўсёды помнілі, што кожнае зернетка старэйшае за нас, і ведалі, што яно вечнае. Яно захоўвае ў сабе жыццё тысячагоддзямі. Заўсёды гатовае нарадзіць колас. Зярняты, знойдзеныя ў грабніцах фараонаў, праз тысячы гадоў кінутыя ў зямлю, прарасталі і давалі ўраджай (*Паводле Янкі Сіпакова).*

4. Прачытайце тэкст. Якія коды рускай культуры можна вылучыць у змесце тэксту? Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Ці супадаюць па сэнсе перакладчыцкія адпаведнікі з арыгінальнымі культурна-моўнымі элементамі? Якія сімвалы беларускай культуры можна суаднесці з прыведзенымі ў апошнім абзацы цытатамі з вершаў рускіх паэтаў?

Ты идешь, а окрестный мир снабжает тебя информацией. Эта информация, по правде говоря, не назойлива, не угнетающа. Она не

Репозиторий ВГУ

похожа на радиоприемник, который ты не волен выключить. Или на газету, которую утром ты не можешь не пробежать глазами. Или на телевизор, от которого ты не отрываешься в силу охватившей тебя (под влиянием все той же информации) апатии. Или на вывески, рекламы и лозунги, которыми испещрены городские улицы.

Это иная, очень тактичная, я бы даже сказал – ласковая информация. От нее не учащается сердцебиение, не истощаются нервы, не грозит бессонница. Но все же внимание твое рассеивается лучами от одной точки ко многим точкам.

Один лучик – к ромашке (не погадать ли на старости лет – и тут далеко уводящая цепочка ассоциаций), второй лучик – к березе ("чета белеющих берез"), третий лучик – к лесной опушке ("когда в листве сырой и ржавой рябины заалеет гроздь"), четвертый – к летящей птице ("Сердце – летящая птица, в сердце – щемящая лень").

Літаратура

1. Басава, Г.І. Святло слова : Дапам. па лінгвакультуралогіі для студ. філал. спец. / Г.М. Басава. – Мінск, 2002.

2. Мельнікава, А.М. Мастацкі тэкст як фактар нацыянальнага / А.М. Мельнікава // Текст в лингвистической теории и методике преподавания филологических дисциплин: Матер. 2-й Междунар. науч. конф., 26–27 марта 2003 г., Мозырь. Ч. 2. – Мозырь, 2003. – С. 168–170.

3. Рагойша, В.П. Проблемы перевода с близкородственных языков / В.П. Рагойша. – М., 1980.

4. Садоўскі, П. В. Культурна-моўныя пытанні беларускага перакладу / П.В. Садоўскі // Полымя. – 1981. – № 7. – С.178–198.

5. Сорокин, Ю.А., Морковкин, И.Ю. Национально-культурная специфика художественного текста: Конспект лекций / Ю.А. Сорокин, И.Ю. Морковкин. – М., 1989.

6. Шидловский, А.В. Лингвистические проблемы перевода на белорусский язык / А.В. Шидловский. – Минск, 1978.

Модуль 2
ЛЕКСІЧНАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Практычныя заняткі 1
Слоўнікавае багацце беларускай мовы

Ключавыя паняцці: *спрадвечна беларуская і запазычаная лексіка, уласна беларуская лексіка, іншамоўныя словы, агульнаўжывальная лексіка, лексіка абмежаванага ўжывання, дыялекты, жаргоны, прафесіяналізмы.*

Репозиторий ВГУ

Пытанні для абмеркавання

1. Ахарактарызуйце лексіку беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная). Чаму пласт агульнаславянскай лексікі хоць і нешматлікі (паводле М.М. Шанскага, «не больш як дзве тысячы» слоў), але з'яўляецца ядром слоўніка кожнай славянскай мовы?

2. Раскажыце пра падзел лексікі беларускай мовы паводле сферы ўжывання (агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага ўжывання).

Заданні

1. Што ўключаецца ў паняцце *«спрадвечна беларуская лексіка»?* Запішыце 10 слоў, утвораных ад агульнаславянскага назоўніка *рука*.

2. Вызначце, якія з пададзеных слоў з'яўляюцца запазычанымі, а якія – беларускімі, вытворнымі ад запазычаных.

УЗОР: *бульба* – запазычанне з лацінскай мовы (bulbos – клубень), утвораныя ўласнабеларускія словы: *бульбоўнік, бульбяны, бульбянішча, бульбіна, бульбачка, бульбянік*.

Язмін, язмінавы, штаб, штабны, штабнік, аўтар, аўтарскі, аўтарства, фабрыка, фабрычны, спорт, спартыўны, экзамен, экзаменаваць, эфект, эфектны, эфектнасць, эфектна, эфектыўны, эфектыўна, эфектыўнасць, бронза, бранзавець, бранзаваць, бранзавацца, факультэт, факультэцкі, герой, геройскі, гераічны, геройства, агітацыя, агітацыйны, агітацыйнасць, агітка.

3. Вызначце па фанетычна-марфалагічных прыметах мову-крыніцу прыведзеных запазычанняў. Некаторыя з гэтых прымет:

- ✓ канцавы элемент *-інг(-ынг)* – у англійскай мове;
- ✓ пачатковыя спа-лучэнні *шт, шп, шр* – у нямецкай мове;
- ✓ канцавыя націскныя галосныя -е*(-э), -о, -і*, канцавыя *-эр,- ёр,- юр, -аж(-яж),* спалучэнні *уа, лье, льё, лья*, губны+ *ю* – у французскай мове; канцавыя – *ент (-энт), -ум, -ура, -ус(-юс), -ій, -цыя(-ія*) – у лацінскай мове.

Дыктатура, акварыум, бюджэт, бюлетэнь, кампанент, дыямент, плюс, казус, кансэнсус, шпіянаж, мітынг, спінінг, шпілька, фюзеляж, пюрэ, ваяж, ажыятаж, пляж, сакваяж, кіно, метро, казіно, ордэр, суфлёр, манікюр, тратуар, амплуа, мемуары, мільён, трыльён, блюмінг, аліменты, вакуум, калёквіум, кансіліум, лігатура, полюс, радыус, градус, стыпендыя, акцыя, гравюра, камюніке, бюст, вуаль, буржуазія, марсельеза, апанент, аргумент, фундамент, абітурыент, пленум, прэзідыум, практыкум, квадратура, гербарый, санаторый, партэр, манцёр, рэжысёр, акцёр, шафёр, дублёр, більярд, мільярд, медальён, кулуары, сітуацыя, бардзюр, маркетынг, таксі, акцэнт, прэтэндэнт, кансіліум, кворум, карэктура, смокінг, рынг, штанга, натарыус, карбюратар, шпіён, шпроты, барэльеф, батальён, фельетон, туалет, лікёр, дрэнаж, віраж, гараж, макіяж, экіпаж, філе, бардо, фае, шпінат, кемпінг.

Репозиторий ВГУ

4. На якой падставе трэба лічыць, што змешчаныя ніжэй словы з'яўляюцца запазычаннямі з рускай мовы? Растлумачце паходжанне выдзеленых слоў.

Абязлічка, агнямёт, азнаменаваць, бомж, бурлак, ваенком, ваенрук, процівагаз, самба, сачыненне, сельпо, слёзатачывы, урон, учотчык, чэкіст.

5. Прачытайце верш. У чым, на вашу думку, асаблівасць лексікі верша С. Грахоўскага?

У выраі ветразь знікае
За хваляй, нібы на спачын,
І змора яго не злякае,
Не спыніць тугой далячынь.
У змроку зіхоткая здрада
Завабіць хлуснёй у віры,
На золку сканае прынада
І кволы прамень на жвіры.
Раптоўна згаданыя мроі
У карунках пяшчотнай тугі
Павольна знікаюць, як строі,
У бязважкасці кволай смугі.
Знікае ўсхвалёваны ветразь:
З кунегаю пільна сачу,
Як водар аздобіў паветра,
І ў бездані знічкі лічу. *(С. Грахоўскі)*

6. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Знайдзіце ў ім прыклады спецыяльнай лексікі.

Очень важным аспектом речи является ежедневное поведение человека в общении с другими людьми, его способность разговаривать учтиво, вежливо, то есть соблюдая правила речевого этикета.

Чтобы понять эти правила, сначала задумаемся над тем, что обозначает слово этикет. Оно пришло к нам из французского языка, где имеет значение «ярлык», «этикетка». А в свое время этом слово появилось на основе греческого *ethos* – «обычай», «характер». Этикет – установленный порядок поведения, форм обхождения. Следовательно, речевой этикет – правила поведения, принятые в речевом общении между людьми. И нужны эти правила для того, чтобы поддерживать положительную тональность разговора. Именно из уст культурного и вежливого человека мы слышим этикетные выражения: добро пожаловать; приятного аппетита; благодарю вас; будьте здоровы; извините меня; пожалуйста; добрый вечер.

Важность речевого поведения хорошо осознавали еще в древности. Так, в «Поучениях» Владимира Мономаха читаем: «Не пропустите человека, не поприветствовав его, и доброе слово ему молвите» *(С. Львова)*

Репозиторий ВГУ

7. Прачытайце тэкст. Выпішыце лінгвістычныя тэрміны.

Этнонімы (ад грэч. ethnos – народ + onyma – імя) уяўляюць сабой назвы любога этнасу: плямёнаў, народнасцей, этнічных груп, нацый і пад. Гэта надзвычай спецыфічныя моўныя адзінкі. Цікава ўжо тое, што сярод вучоных няма поўнага адзінства пры вызначэнні катэгарыяльнага статуса этнонімаў. Адны даследчыкі лічаць іх імёнамі ўласнымі, другія – агульнымі. Аднак у любым выпадку цесная сувязь этнонімаў з такімі лексічнымі групамі, як антрапонімы (імёны людзей) і тапонімы (найменні геаграфічных аб'ектаў), якія бясспрэчна адносяцца да анамастычнай часткі лексікі, дазваляе выкарыстоўваць пры даследаванні этнонімаў тыя ж метады, што і ў выпадку з іншымі ўласнымі імёнамі.

Этнонімы – навукова значная крыніца пры вывучэнні рыс жыцця і побыту насельнікаў пэўнай тэрыторыі, іх моўна-этнічнай прыналежнасці, характару матэрыяльнай і духоўнай культуры, геаграфічнага пашырэння і размежавання этнасаў, міжэтнічных стасункаў, узроўню сацыяльнага і тэалагічнага развіцця, напрамкаў міграцыі, пэўных моўных асаблівасцяў і г.д. *(І. Гапоненка)*

Літаратура

1. Адамовіч, Я.М. Беларуская мова / Я.М. Адамовіч. – Мінск, 1987.
2. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / А.Я. Баханькоў. – Мінск, 1994.
3. Лепешаў, І.Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора / І.Я. Лепешаў. – Гродна, 2000. – Ч. 2.
4. Лепешаў, І.Я. Практыкум па беларускай мове / І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, К.М. Панюціч. – Мінск, 2001.
5. Лепешаў, І.Я. Практыкум па лексікалогіі і фразеалогіі / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Гродна, 2001.
6. Сямешка, Л.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996.

Практычныя заняткі 2
Лексічнае значэнне слова

Ключавыя паняцці: *лексічнае значэнне слова, уласна беларуская лексіка, лексічная спалучальнасць, безэквівалентная лексіка, матываваныя і нематываваныя словы, прамое і пераноснае значэнне слова, метафара, метанімія, сінекдаха, антрапонімы.*

Пытанні для абмеркавання

1. Спецыфіка спосабаў намінацыі ў мове. Якія лексічныя значэнні нюцца нематываванымі, а якія – матываванымі?
2. Лексічная спалучальнасць.
3. Безэквівалентная лексіка.
4. Нацыянальна-культурная спецыфіка беларускіх антрапонімаў

Репозиторий ВГУ

Заданні

1. Раскрыйце лексічнае значэнне матываваных назваў, выкарыстоўваючы пры гэтым матывавальную частку адпаведнага слова.

УЗОР: *ляснік – ‘даглядчык і вартаўнік лесу’.*

Дуб, землямер, палясоўшчык, узлесак, зямля, пазямельны, вада, нага, ісці, несці, карова, рука, дубовы, лес, дубняк, лесавік, лесаруб, лесапасадачны, садавіна, рукавіца, журавіна, шыла, мыла, пралеска, падснежнік, лясны, падлесак, пералесак, залесіць, леснікаваць, леснічоўка, лесаахоўны, лесахімік, Палессе, падземны, чужаземны.

2. Карыстаючыся ТСБМ, вызначце значэнне слова *галава* ў пададзеных сказах. Адкажыце, якім спосабам развілося тое ці іншае значэнне.

1. Дзед Талаш зняў шапку і бліснуў лысаю галавою. (К-с) 2. – Гандаль патрабуе добрай галавы, – разважна сказаў гаспадар. 3. Пасля смерці жонкі, якая была галавой у хаце, Трахім занядбаў гас-падарку. (Чарн.) 4. Пятро тым часам выйшаў на гарод. Там цяпер адны качаны капусты бялелі галовамі. (Н.)7. Былы гарадскі галава сустрэў іх з хлебам і соллю. (Гур.) 5. Тыя, што ў галаве чаргі, трымаюцца сваіх месц.(Л.П.)

3. Па наступных мадэлях складзіце сказы са словамі, адно значэнне якіх – прамое, а другое – заснаванае на сінекдахічным пераасэнсаванні.

1. Дрэва ці расліна – іх плады (сліва, вішня, груша, агрэст, рабіна, маліна).

УЗОР: *Сліва зацвітае, на яе не наглядзецца. Паўвядра сліў сабралі – спелых, салодкіх.*

2. Агародныя расліны – карняплоды гэтых раслін (бульба, рэпа, цыбуля, буракі, морква)

3. Расліны, збожжавыя – іх насенне, зерне (фасоля, мак, пшаніца, жыта, ячмень, авёс).

4. Адгадайце загадкі. Запішыце словазлучэнні са словамі-адгадкамі, якія выяўляюць іх значэнне. Якая лексічная з’ява ў аснове загадак?

1. Я касой траву кашу у зялёным лузе, а другую я нашу пастаянна ў пузе. Трэцюю, я вам скажу, носіць мая дочка, на чацвёртай я ляжу – грэюся ў пясочку.

2. Сядзіць на дыване султан на султане, а што гэта значыць, прашу растлумачыць.

3. У іх розны нораў і розныя сцежкі: адзін любіць плаваць, другі ходзіць пешкі. Напэўна, нам будзе нямнога работы самім здагадацца, што гэта за боты.

4. Розных бабак шмат на свеце. Тры з іх добра я прымеціў: біў адну я малатком, еў другую з малаком, а трэцяя бабка – карэньчык ды шапка.

Рэпозиторий ВГУ

5. Коні ўдалыя, але ж разам іх не запражэш. На адным мы з вецярком прагуляемся вярхом. А захочам, дык і ў брычцы на ім можам пракаціцца. Другі конік – гарбунок з галавою, ды без ног – на яго вярхом не сядзеш. Дзіва ўсё ж, калі паглядзіш, як ён жыва, спрытна скача (не якая-небудзь кляча), і не ўмее хоць брыкацца, каралі яго баяцца.

Літаратура

1. Баханькоў, А.Я. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы/ А.Я. Баханькоў. – Мінск, 1994.

2. Гіруцкая, Л.А. Беларуская мова (прафесійная лексіка) / Л.А. Гіруцкая. – Мінск, 2005.

3. Лепешаў, І.Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора / І.Я. Лепешаў. – Гродна, 2000. – Ч. 2.

4. Лепешаў, І.Я. Практыкум па беларускай мове / І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, К.М. Панюціч. – Мінск, 2001.

5. Лепешаў, І.Я. Практыкум па лексікалогіі і фразеалогіі / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Гродна, 2001.

6. Сямешка, Л.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996.

Практычныя заняткі 3
Фразеалагізмы і іх ужыванне ў мове

Ключавыя паняцці: *фразеалагічная адзінка, спрадвечна беларускія фразеалагізмы, запазычаныя фразеалагізмы, кніжныя фразеалагізмы, размоўныя фразеалагізмы*

Пытанні для абмеркавання

1. Крыніцы беларускай фразеалогіі.
2. Класіфікацыя фразеалагічных зваротаў паводле паходжання (уласнабеларускія, запазычаныя, калькі).
3. Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў.

Заданні:

1. Знайдзіце ў сказах фразеалагізмы. Растлумачце, як вы разумееце выказванне І.Я. Лепешава “Разам са словамі фразеалагізмы з’яўляюцца «будаўнічым матэрыялам» для сказаў”

1. «Толькі пачаў станавіцца як мае быць на ногі! – балюча пякло Васіля. – Толькі пачаў жыць!.. І от – на табе!..» (І.М.) 2. З гарнізона вёска відаць як на далоні, а пяць кіламетраў матацыклам, грузавікам, браневіку – зусім не адлегласць, рукою падаць. (Янк.) 3. Усю ноч Раман не звёў ні на валасок вачэй. (Сач.) 4. Каму-каму, а Валошку маніць – не дай бог. На чыстую ваду ўсё роўна выведзе. Не сёння, дык заўтра. (Кар.) 5. На ўсе, як кажуць, застаўкі ўсміхнуўся Мікола. (Б.) 6. Усе яны трошкі хвалькі, пыл любяць пускаць у вочы і як бы надзелі на сябе маскі страшэнных зухаў, якім мора па калена (І.Н.) 7. Націснулі, што называецца, на ўсе кнопкі,

Репозиторий ВГУ

застукалі ва ўсе дзверы. (Крап.) 8. Я не ківаю на Пятра, я толькі гавару, што і мы не ў бога цялятка ўкралі... Што? Я, таварыш Варонін, словамі не кідаюся. І вы мяне, калі ласка... Што?.. (Б.)

2. Выпішыце з «Этымалагічнага слоўніка фразеалагізмаў» І.Я. Лепешава выразы па 5 фразеалагізмаў, класіфікуючы іх у групы паводле паходжання (агульны для ўсходнеславянскіх моў, уласна беларускі, калька з лацінскай мовы, паўкалька з рускай мовы і г.д.).

3. Растлумачце значэнне фразеалагізмаў. Складзіце 5 сказаў з фразеалагізмамі на выбар.

Бог бацька, біць няма каму(каго), начная зязюля, глядзець у корань, абіванне парогаў, перамыванне костачак, чортаў тузін, цыганскае сонца, чым чорт не жартуе, як бы не так, да трох не гавары(з кім), казёл адпушчэння, цёмны лес, глядзець зверху ўніз, вока не запарушыць(каму), хутчэй за ўсё, заснуць вечным сном, прыгожы пол, як той казаў, лебядзіная песня, званіць ва ўсе званы, і карты ў рукі (каму), рукі кароткія (у каго), пад рукамі, масты спалены, з калена не выламіш, сядзець склаўшы рукі.

4. Растлумачце значэнне фразеалагізмаў і разгрупуйце іх паводле суадноснасці з часцінамі мовы.

Абы з рук, як рукой падаць, як мыш на крупы, абое рабое, ветрам падшыты, горкі хлеб, голас у голас, на адзін капыл, душа ў душу, ламаць камедыю, сухоты кішаньковыя, век вяком, нешта нейкае, аж пяткі блішчаць, даць маху, зямля ненаедная, аж пыл курыць, вось табе і на!, на адзін капыл.

5. Прачытайце ўрыўкі, у якіх ёсць прыказкі. Запішыце фразеалагізмы, якія ўтварыліся ў выніку скарачэння гэтых прыказак.

1. Не чакаў я ад цябе гэтага. – За двума зайцамі пагонішся, ні аднаго не зловіш. (Гур.) 2. – Я, штоб адчапіцца ад яго, абяцала прыйсці. – Абяцанка цацанка, а дурному радасць. (Д.-М.) 3. Вандроўкі на хутар не дужа вабілі Лабановіча... Ды ўжо адступаць позна. Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж. (К-с)4. Колькі ты яе ведаеш? Зусім мала. А можа, яна і не такая, як табе здалося. Каб чалавека пазнаць, трэба пуд солі з'есці. (Л.Г.) 5. А людзі кажуць, лепш сініца ў руцэ, чым журавель у небе. Ну, чым Лёня горшы за твайго Антона? (Пальч.) 6. Бач ты, як мякка сцелеш... Бач, як ты ўжо запеў! Ну але, але, ліслівае цялятка дзве маткі мае... (П.М.) 8. Каму мы тут трэба, хто аб нас падумае... Жывём як той гарох пры дарозе – хто ідзе, той і скубе. (Лыньк.) 9. А можа, Казлоўскі сам гэты партрэт перавярнуў. Старога вераб'я на мякіне не правядзеш. (Л.П.)

Літаратура

1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск: БелЭН, 1994. – С. 589–593.

2. Красней, В.П. Сучасная беларуская мова: Лексікалогія. Фразеалогія. – Мінск: "Універсітэцкае", 1984.

Репозиторий ВГУ

3. Сямешка, Л.І. Беларуская мова / Л.І. Сямешка. – Мінск, 1999. – С. 252–264.

4. Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2002. – С. 72–145.

5. Лепешаў І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы. – Мінск: Выш. шк., 1998. – С. 3–45, 198–246.

Практычныя заняткі 4
Прыказкі. Прымаўкі. Крылатыя словы. Афарызмы.

Ключавыя паняцці: *прыказкі, прымаўкі, крылатыя словы, афарызмы, парэміі, парэміялогія.*

Пытанні для абмеркавання

1. Дайце азначэнне паняццям *прыказка*, *прымаўка*. Чым адрозніваюцца прыказкі ад прымавак?
2. Якія асаблівасці прыказак выводзяць іх за межы фразеалагізмаў?
3. Як называецца раздзел мовазнаўства, які вывучае прыказкі і прымаўкі?
4. Ці супадаюць паняцці *крылатыя словы* і *афарызмы*?
5. Ці адрозніваюцца шляхі ўзнікнення прыказак , прымавак і крылатых слоў? Раскажыце пра шляхі ўзнікнення гэтых моўных адзінак.

Заданні

1. Размяркуйце па групах прыказкі, прымаўкі і крылатыя выразы. Выпішыце з іх словы, якія адлюстроўваюць нацыянальную культуру Беларусі (назвы рэалій матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, жывёльнага і расліннага свету Беларусі, імёнаў людзей і геаграфічных назваў). Растлумачце значэнне ўстойлівых выразаў.

1) ад жыгучкі трымай далей ручкі;
2) багатаму шкода карабля, а беднаму – кашаля;
3) да пары збан ваду носіць: вушка адарвецца і збан паб’ецца;
4) злазь з даху, ды не псуй гонтаў;
5) калок свой мілейшы, як чужыя клямкі (Ф.Багушэвіч);
6) каму па каму, а каму два камы;
7) ліхтаром пушчы не асвеціш;
8) не заўсягды, як на Дзяды, а працы, як у нядзелю;
9) няхай жыве беларуская птушка бацян;
10) пазнаюць нашу дачку і ў андарачку;
11) хіцер Зміцер, але і Саўка не дурны;
12) як шанцуе, тады і Халімон танцуе.

2. Прачытайце тэкст, замяняючы словы ў дужках аднакаранёвымі дзеясловамі. Вызначце стыль і тып тэксту. Чаму аўтар параўноўвае прыказку з узорам на кашулі-вышыванцы?

Репозиторий ВГУ

3. Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі.

Прыказка, як узор на кашулі-вышыванцы, *(жывы), (багаты)* выказванне. Яна часта *(дакладны)* з'яву, падзею. Аздобленая прыказкай думка закранае розум, *(поўны)* сэрца. Менавіта агульначалавечае ў прыказках розных народаў *(блізкі)* людзей, вядзе да дружбы *(Паводле У. Калесніка).*

4. Запішыце прыказкі, утварыўшы ад слоў у дужках дзеясловы з прыстаўкамі *пра-, с-, вы-, па-* або паставіўшы ў патрэбную форму. Пад якіх тэмах можна аб'яднаць прыказкі?

1. Без навукі і лапця не *(плесці)*. 2. Што *(вучыць)* у маладосці, таго не забудзеш у старасці. 3. З разумным *(гаварыць)* – набрацца розуму. 4. Чужым розумам не *(жыць)*. Каб рыбку з'есці, трэба ў ваду лезці. 2. Слова можа параніць і можа загаіць. 3. У крыніцу не носяць вадзіцу. 4. Паносіш мазалёў – *(есці)* хлеба. 5. Не хвалі сябе, няхай людзі *(хваліць)*.6. Лепш дзесяць прыяцеляў, чым адзін вораг. 7. Вада сябра лепей за мёд ворага. 8. Мудрэц свайго розуму не *(паказаць)*. 9. Блізкі сусед лепш за дальняга родзіча. 10. Дзе маці нарадзіла, там і радзіма. 11. Лепш у сваякоў з голаду ўмерці, чым у чужакоў золата збіраць.

5. Запішыце ўстойлівыя выразы. Знайдзіце ў іх структуры дыялектныя словы.

1. Або грай, або грошы (скрыпку) аддай. 2. Добраму чалавечку добра і ў запечку, а якой благаце дрэнна і на куце. 3. Каму па каму, а каму два камы. 4. Карову б'юць за зык, а бабу за язык. 5. Муж і жонка – найлепшая сполка. 6. Хто дужшы, той і прутшы. 7. Цешыцца старац, што перажыў марац, ажно ў маю нясуць яго да гаю. 8. Што каму рупіць, той тое і жупіць.

6. Успомніце і запішыце аўтараў крылатых выслоўяў.

1. Бывайце здаровы, жывіце багата. 2. Каб сонца засланіць – вушэй асліных мала. 3. Людзьмі звацца! 4. Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы! 5. Вучыся, нябожа, вучэнне паможа. 6. Выбачайце, калі ласка! 7. Другі баран – ні "бэ", ні "мя", а любіць гучнае імя. 8. Забілі зайца – не забілі, але ж, брат, гуку нарабілі. 9. Малому веліччу быць хочацца заўсёды. 10. Назад не прыйдзе хваля тая, што з быстрай рэчкай уплывае. 11. Няма таго, што раньш было… 12. Усё мілагучна для слыху майго: і звонкае "дзе" і густое "чаго".

Літаратура

1. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск: БелЭН, 1994. – С. 589–593.

2. Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2002. – С. 72–145.

3. Лепешаў І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы. – Мінск: Выш. шк., 1998. – С. 3–45, 198–246.

4. Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік / П.У. Сцяцко. – Гродна: ГрДУ, 2001. – С. 100–103.

Репозиторий ВГУ

Модуль 3
ФУНКЦЫЯНАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ВА ЎМОВАХ БІЛІНГВІЗМУ

Практычныя заняткі 1
Фанетыка і арфаэпія

Ключавыя паняцці: *фанетыка, гук, фанетычныя законы беларускай мовы, асіміляцыя, прыстаўныя гукі, пазіцыя гукаў, чаргаванне гукаў, арфаэпія, арфаэпічная норма бедарускага літаратурнага вымаўлення***.**

Пытанні для абмеркавання

1. Аспекты вывучэння гукаў.
2. Фанетычныя асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай.
3. Асноўныя нормы беларускага літаратурнга вымаўлення і прычыны іх парушэння.
4. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім.

Заданні

1. Прачытайце тэкст. Перакладзіце на беларускую мову.

Букву и звук нельзя путать. А часто путают – причем всегда срадает звук (сказывается преклонение перед письменной речью).

Буква – фигурная линия, рисунок (недаром многие художники прославились как мастера рисованного шрифта). Рисунок произнести нельзя.

Неращличение звука и буквы мешает понять строение языка. И.А. Бодуэн де Куртенэ писал: кто смешивает звук и букву, письмо и язык, «тот только с трудом отучится, а может быть и никогда не отучится смешивать человека с паспортом, национальность с алфавитом, селовеческое достоинство с чином и званием» *(По М. Панову).*

2. Прачытайце тэкст. Перакажыце яго. Выпішыце з тэксту словы, у якіх: 1) гукаў больш, чым літар; 2) колькасць гукаў і літар супадае; 3) літар больш, чым гукаў.

Цікава ведаць, што чалавецтву даволі доўга давялося засвойваць простуюдумку: “Гукі мы чуем і вымаўляем, а літары бачым і пішам”. Вядома, што яшчэ ў VIII стагоддзі Алкуін – прыдворны мудрэц імператара Карла Вялікага – з дапамогай розгаў прымушаў сваіх выхаванцаў усвядоміць розніцу паміж гукмі і літарамі. Часам гісторыя засваення паняццяў набывала нават трагічныя формы. Для царквы заўсёды была важнай і першаснай літара, і ў часы цемрашальства сцвярджэнне, што “спачатку быў гук, а потым літара”, выклікала абурэнне і было небяспечным для таго, хто выказаў такую думку *(Паводле Л. Выгоннай).*

Репозиторий ВГУ

3. Адзначце словы, у якіх спалучэннем літар *ДЗ* і *ДЖ* перадаецца адзін гук.

1) адзначыць; 2) надзённы; 3) бяздзейнасць; 4) падзямелле; 5) дзяцінства; 6) аджартавацца; 7) джала; 8) пасаджу; 9) паджаць; 10) агароджа; 11) падземны; 12) дзяжурства; 13) вадзіць; 14) адзваніць; 15) адзенне; 16) дажджы; 17) ураджайны; 18) аджаваць; 19) паджылкі; 20) прыязджаць; 21) хаджу; 22) аджыць; 23) паджаць; 24) падзагаловак; 25) надзея; 26) падземка; 27) лебядзіны; 28) падзарабіць; 29) аддзяліць; 30) пэндзаль.

4. Адзначце словы (спалучэнні слоў), вымаўленне якіх не супадае з напісаннем.

1) карагод; 2) касцюм; 3) мярэжка; 4) перакідваць; 5) лес і возера; 6) перамешваць; 7) гарбуз; 8) прыдарожны; 9) паслядоўнік; 10) трава і дрэвы; 11) касцёл; 12) перадрукоўваць; 13) дрозд; 14) лодка; 15) ягады і грыбы; 16) павялічваць; 17) дождж; 18) дуб і бяроза; 19) вузкі; 20) параўнаць; 21) касцісты; 22) рэпартаж; 23) пераконваць; 24) даведка; 25) рабіна і сасна; 26) перад Іванам; 27) грыб; 28) лёгкі; 29) прайграць; 30) узмежак; 31) перазвоньваць; 32) склад; 33) касцюковіцкі; 34) высадка; 35) брат і сястра;

5. Адзначце нумары слоў, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.

1) ехаць; 2) дзверы; 3) бераг; 4) мёд; 5) маёр; 6) носьбіт; 7) аб'ект; 8) весялосць; 9) лью; 10) мельхіёр; 11) снег; 12) агледзься; 13) жыццё; 14) маё; 15) дзьме; 16) салаўі; 17) пасьянс; 18) яма; 19) падземны; 20) дзяжурны; 21) крэйда; 22) дзень; 23) лье; 24) дождж; 25) песня.

6. Адзначце і зрабіце транскрыпцыю слоў, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [Ч] :

1) паляўнічы; 2) перакладчык; 3) сучча; 4) чаргаванне; 5) адчапіць; 6) прытча; 7) чыноўнік; 8) суседчын; 9) чалавечы; 10) човен

падоўжаны гук [Ц]:

1) палацы; 2) на кладцы; 3) падцмокваць; 4) падцёк; 5) адсадзіць; 6) на палачцы; 7) у дварцы; 8) на сцежцы; 9) цяплець; 10) адцадзіць.

Літаратура

1. Асновы культуры маўлення і стылістыкі. – Мн., 1992. – 255 с.
2. Антанюк, Л.А. Беларуская мова прафесійная лексіка: Курс лекцый / Антанюк Л.А., Плотнікаў Б.А. – 3-е выданне. – Мн., 2005. – 240 с.
3. Беларуская мова. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Марфалогія. – Мн.: Вышэйшая школа. – 1987. – 429 с.
4. Сямешка, Л.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996.

Репозиторий ВГУ

Практычныя заняткі 2
Графіка і арфаграфія

Ключавыя паняцці: *графічная сістэма беларускай мовы, арфграфія, арфагрфічная норма беларускай літаратурнй мовы*

Пытанні для абмеркавання

1. Пісьмо ў гісторыя развіцця чалавецтва.
2. З гісторыі беларускай графікі. Лацініца і кірыліца.
3. Прынцыпы беларускай арфаграфіі.
4. Арфаграфічныя нормы.

Заданні

1. Спішыце, устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс.

Р..знакаляровы, р..знагалосы, р..знавіднасць, д..брабыт, д..браякасны, п..ліклініка, п..літэхнічны, св..еасаблівы, шт..лета, п..ўдзень, ч..рнабровы, ч..рнабароды, шыр..каплечы, шыр..каэкранны, п..ўнапраўны, мн..галюдны, р..дкалессе, Н..ваполацк, м..вазнаўчы, в..льналюбівы, н..вагодні, рады..завод, м..таспорт, рады..аматар, ст..годдзе, ф..такопія, ф..таапарат, земл..роб, зерн..сушылка, сін..вокі, ільн..завод, шкл..валакно.

2. Ад наступных спалучэнняў слоў утварыце складаныя словы і запішыце іх. Растлумачце правапіс галосных.

У З О Р: *Чорныя вочы – чарнавокі.*

Светлыя валасы, розны колер, высокі ўраджай, добрая якасць, розныя галасы, чорныя бровы, чорная барада, сельская гаспадарка, востры верх, зямлю капаць, сена касіць, доўга чакаць, сто год, роўныя правы, здабываць вугаль, тры паверхі, шмат год, змяніць словы.

3. Спішыце, скараціце, дзе трэба *у*.

Во*(у, ў)*к, со*(у, ў)*с, ва У*(у, ў)*збекістане, па*(у, ў)*за, аквары*(у, ў)*м, ля *(у, ў)*нівермага, па*(у, ў)*днёва-*(у, ў)*сходні, рака У*(у, ў) (у, ў)*са, тры*(у, ў)*мф, па-*(у, ў)*дарнаму, шлагба*(у, ў)*м, ла*(у, ў)*рэат, педагагічны *(у, ў)*ніверсітэт, пры князю У*(у, ў)*сяславе, працава*(у, ў)* у рэдакцыі, рэперт*(у, ў)*ар, на *(у, ў)*злессі, а(у, ў)тамат, стаялі (у,ў) пяці кроках.

4. Выпраўце памылкі ў правапісе слоў.

Гуляу у садзе, расце у лесе, дыназаур, бавоуна, індывідуум, ауторак, есаул, заучасна, доуга, манеур, страус, двоеуладдзе, апоудзень, шэдэур, вакуум, гладыёлус, каунер, рытуал, аутар, агрэсіуны, баул, няуважлівы, лауры, накаут, ва універсітэце, радаснае “ура”, зноу успомніуся, Вольга Уладзіславаўна, пауз бераг ракі Усы, з’ява унікальная, пауночна-усходняя ускраіна, у “Выбраныя творы “ увайшлі.

5. Растлумачце напісанне прыслоўяў.

Дапамагчы па-суседску, ісці паціху, зрабіць па-мойму, глянуць спадылба, разбураны дашчэнту, заклеены крыж-накрыж, убачыць ўпершыню, па-дамашняму ўтульна, падзяліць пароўну, наадрэз адмовіць,

Репозиторий ВГУ

дзе-небудзь прысесці, паглядзець уніз, падоўгу не бачыцца, разысціся па-добраму, назаўжды ўдзячны, зрабіць абы-як, час ад часу ўспамінаць, адказаць па-беларуску, глянуць налева.

Літаратура

1. Аляхновіч, М.М. і інш. Беларуская мова: практыкум / М.М. Аляхновіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 1993.
2. Камароўскі, Я.М. Беларуская мова: дапаможнік для абітурыентаў / Я.М. Камароўскі, Е.С. Мяцельская. – Мінск : Універсітэцкае, 1993.
3. Цыбульская, С.І. Рыхтуемся да пераказу па беларускай мове / С.І. Цыбульская, А.М. Копач. – Мінск : ТетраСістемс, 2002.
4. Бурак, Л.І. Сучасная беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя: практыкум / Л.І. Бурак, І.Л. Бурак. – Мінск : Універсітэцкае, 1993.
5. Беларуская мова: энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск, 1994.
6. Лепешаў, І.Я. Беларуская мова: практыкум / І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, К.М. Панюціч. – Мінск, 2005.

Практычныя заняткі 3
Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы

Ключавыя паняцці: *часціны мовы; самастойныя часціны мовы, граматычгыя катэгорыі часцін мовы, род і лік назоўнікаў, род абрэвіятуры, ступені параўнання якасных прыметнікаў, дзеяслоў, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе.*

Пытанні для абмеркавання

1. Разыходжанне ў родзе і ліку назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.
2. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеней параўнання якасных прыметнікаў.
3. Скланенне лічэбнікаў і асаблівасці іх ужывання з назоўнікамі.
4. Дзеяслоў. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова. Асаблівасці іх утварэння і ўжывання ў беларускай мове.
5. Спосабы перадачы дзеепрыметнікаў пры перакладзе на беларускую мову

Заданні

1. Перакладзіце тэкст на беларускую мову і запішыце. Вызначце стыль і тып. Абгрунтуйце сваю думку.

Книга – это духовное завещание одного поколения другому, совет умирающего старца юноше, начинающему жить, приказ, передаваемый часовым, отправляющимся на отдых, часовому, заступающему на его место. Вся жизнь человечества последовательно оседала в книге: племена, люди, государства исчезали, а книга оставалась. Она росла вместе с человечеством, в нее кристаллизовались все учения, потрясающие умы,

Репозиторий ВГУ

в нее записана та огромная исповедь бурной жизни человечества, та огромная автография, которая называется всемирной историей. Но в книге не одно прошедшее: она составляет документ, по которому мы вводимся во владение настоящим, во владение всей суммой истин и усилий, найденных страданием, облитых иногда кровавым потом, она – программа будущего. Итак, мы будем уважать книгу. Это – мысль человека, получившая относительную самобыность, это – след, который он оставил. *(А. Герцен)*

2. Вызначце, да якога роду адносяцца выдзеленыя назоўнікі.

Быць сведкам, музы'ка з Мядзеля, міліцыянер Петрусёва, права на адукацыю, з выхвалякам суседам, збірацца на жніво, убрацца ў шэрань, накіп на чайніку, вакса для абутку, ротны запявала, акуліст Кавалёва, шынель афіцэра, у любой справе дока, качур без сяброўкі, новая лістаноша, Уганда ўжо недалёка, прафесар Іванова, пакласці ў кішэнь, мастак-самавучка, наступіла раўнадзенства, крылца матылька, рысь – драпежны звер, таленавіты ляўша, насып пры дарозе

3. Вызначце, які род маюць выдзеленыя назоўнікі. З трыма словазлучэннямі пабудуйце сказы.

Рунь у расе, раскласці вогнішча, задуменны Слава, возера Свір, трэль салаўя, тэрапеўт Антонава, герань на акне, падкаваць каняку, паездка ў Уругвай, іржышча насупраць дома, землямер Сяргеева, шыр неба, хадайніцтва інстытута, дызайнер Васільева, боль у спіне, сірата Алеся, квецень садоў, дзяўчо з белымі валасамі, глядзець вадэвіль, непаседа Аленка, тунель уздоўж дарогі, даследчык Цімафеева, перапіс насельніцтва, хлапчаня ў шырокім паліто, забіяка певень

4. Падбярыце прыметнікі да прапанаваных назоўнікаў.

Гідальга, какаду, папуры, бурыме, Батумі, мецца, жалюзі, Жуліа, грызлі, Осла, куцюр'е, Сочы, індыга, По (пісьменнік), інжэню, ватэрпола, фламінга, суахілі, івасі, крупье, бістро, Перу, Чад (возера), жако, вета, бенгалі, эфендзі, рэзюме, тарнада, клішэ, калібры, Кіліманджара, манпансье, Элен, кюрэ, кайнэ, янкі, камюніке, пані, Мэры, леча, марабу, Чыкага, ларгета, Чыкага, табу, беры-беры, капрычыа, экю, фрау, Антарыа (правінцыя), Каларада (рака)

5. Запішыце прыметнікі і дзеясловы ў неабходнай форме.

1. Шумн.. мнагалюдн.. Осла. На галоўн.. авеню – утульн.. кафэ "Ружов.. фламінга". Гучыць прыемн.. сапрана. За столікам каля сцяны, дзе вісіць прыгож.. бра, сядзяць юн.. лэдзі і калмат.. хіпі. На лэдзі свабодн.. норкав.. манто, на хіпі – выцвілыя джынсы, світэр і бруднават.. кашнэ. Абедзве жуюць бутэрброды з апетытн.. салямі і салат са свеж.. кальрабі.

Репозиторий ВГУ

Перад лэдзі стаіць моцн.. чорн.. кава, абрыкосав.. суфле і свеж.. безэ, перад хіпі – не менш моцн.. віскі.

2. Было ціха. Спа.. магутн.. арангутанг, драма.. гарыла, храпе.. шымпанзэ. Толькі шустр.. макака ніяк не хаце.. супакоіцца. Задуменн.. гну жава.. сена. Другая антылопа ляжа.. у глыбіні вальера. Гіганцк.. боа спа.., утульна скруціўшыся ў клубок. З сумкі шэр.. кенгуру выглядвала дзіцянё. Амерыканск.. лама моўчкі глядзе.. навокал. Зграбн.. газель пашчыпва.. траўку *(Паводле В. Служэўскай).*

6. Вызначце род абрэвіятур.

РАУС, БТ, аргаддзел, РТС, спецвопратка, камбат, ЦУМ, ЦЭЦ, БДУ, ЭВМ, біяфак, СНТ, АТС, аргработа, прафорг, ЖЭК, БелЭН, ЖЭУ, ТСБМ, ЕС, ВКЛ, НАН, спецкурс, камроты, БелАМ, ЦСУ, медсястра, ЭліМБел, ГУУС, нарсуд, НЗ, БАМ, ГЭС, камандарм, БРС, БелТА, БНТУ, ДАІ, Белтрансгаз, ТБМ, СП, дот, БРСМ, КНР, ВМФ, Мінэканомікі, Белофістэхніка, МАЗ, ФІФА, Цэнтрвыбарком

7. Растлумачце сэнс прыказак. Вызначце назоўнікі адзіночнага ліку, ужытыя ў значэнні множнага.

1. Нязнайка дарогі не пакажа. 2. Ранняя птушка зерне клюе, а позняя вочкі трэ. 3. З песні слова не выкінеш. 4. Гультаю ўсё некалі: яму раніцай росна, у поўдзень млосна, а ўвечары камары кусаюць. 5. Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла.

Літаратура

1. Беларуская граматыка. У 2-х ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; [Рэд. М.В. Бірыла, П.П. Шуба]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985 – 1986. – Ч.1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. – 1985. – С. 50–52.

2. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Беларуская Энцыклапедыя; пад рэд. А.Я. Міхневіча / рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 1994. – С. 334.

3. Лепешаў, І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: дапаможнік / І.Я. Лепешаў. – Гродна: ГрДУ, 2002. – С. 165–166.

5. Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэбны дапаможнік / Н.В. Гаўрош, М.Ц. Кавалёва, Н.М. Нямковіч [і інш.]; пад агульн. рэд. праф. М.С. Яўневіча. – Мінск: Выд Ул.М. Скакун, 1997. – С. 7–15.

6. Сямешка, Л.І., Шкраба, І.Р., Бадзевіч, З.І. Курс беларускай мовы: падручнік / Л.І. Сямешка, І.Р. Шкраба, З.І. Бадзевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996.

Репозиторий БГУ

Модуль 4
КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ

Практычныя заняткі 1
Культура мовы і маўленчая дзейнасць

Пытанні для абмеркавання

1. Назавіце спецыфічныя асаблівасці і сродкі беларускай мовы, выпрацаваныя ў працэсе яе функцыянавання ў грамадстве.
2. Культура маўлення – сукупнасць і сістэма ведаў, якія забяспечваюць аптымальнае прымяненне мовы ў канкрэтны момант. Ахарактарызуйце нормы беларускага маўлення.
3. Ад чаго залежыць культура маўленчых зносін, прамоўніцкае майстэрства, агульная культура асобы?

Заданні

1. Пастаўце правільна націск у словах.

Лубяны, кляштар, металургія, форзац, рымляне, зрабіць за дарма, бліснуць, аўсяны, слыхавы, наспех, дэфіс, філантропія, першынство, ка(о)ршун, крупяны, узялі, прынята, мезенец, каталог, скардзіцца, чайная (памяшканне), крыху, кішка, табу.

2. Запішыце наступныя дзеясловы ў форме 2-й асобы адз. ліку і параўнайце іх напісанне і вымаўленне

Купацца, мыцца, аглядацца, цалавацца, цікавіцца, хваляваццa, здзіўляцца, злавацца, асмеліцца, імкнуцца, дзівіцца, сустрэцца, біцца, апранацца, падабацца.

3. Выпішыце словы і выразы, у якіх адлюстраваны асаблівасці беларускай мовы.

4.

Пакуль яшчэ ў сівых дзядоў
У вуснах тоящца паданні;
Пакуль сланечнік будзіць зноў
Мяне ў вераснёўскім ранні;
Пакуль мы помніць будзем тых,
Хто ў святых баях забіты;
Пакуль вясновыя сады
Выводзяць птушак на арбіты;
Пакуль яшчэ ідуць у бой
З маной і раўнадушшам смела, –
То не загінуць мове той,
Што з вуснаў мацярок зляцела.

(Н. Гальпяровіч)

4. Параўнайце сказы з арыгінальных і перакладных тэкстаў. Выпішыце з іх словазлучэнні, розныя паводле будовы ў беларускай і рускай мовах. Растлумачце, у чым заключаецца розніца.

1. Потым падышоў да адчыненага акна і доўга любаваўся на каштан. – Потом подошёл к открытому окну и долго любовался каштаном.
2. Ён дакрануўся вуснамі да яе шчакі. – Он прикоснулся губами к её щеке.

Репозиторий ВГУ

3. Прысаромлены Зазыба патрываў, пакуль пачне хіліцца на лес сон. – Пристыженный Зазыба выждал, пока начнёт клониться к лесу солнце.

4. Паўз вокны ішоў стараваты чалавек. – Мимо окон прошёл пожилой человек.

5. Ён перадаў гэты тэкст а пятай гадзіне дня. – Он передал этот текст в пять часов дня.

6. Па азнаямленні Лабановіч падзяліў іх на тры групы. – После ознакомления с ними Лобанович разделил их на три группы.

7. Мужчыны нашы днямі ўжо бачылі гэты спектакль. – Мужчины наши на днях уже видели этот спектакль.

5. Перакажыце тэкст, захоўваючы нармы беларускай літаратурнай мовы.

Зорка беларускай паэзіі

Максім Багдановіч – трэцяя пасля Янкі Купалы і Якуба Коласа зорка на небасхіле беларускай паэзіі. Ён памёр зусім малады, на дваццаць шостым годзе свайго жыцця, не паспеўшы сказаць пра многае, што яго хвалявала. Але за свой кароткі век паэт зрабіў так многа для развіцця і ўзбагачэння роднай літаратуры, што спадчына яго стала каштоўным набыткам духоўнай культуры беларускага народа. Вялікі грамадзянін і патрыёт, ён усё сваё кароткае жыццё аддаў служэнню свайму народу. Чалавек шырокай адукацыі, энцыклапедыст у самым поўным сэнсе гэтага слова, Максім Багдановіч ад самых пачаткаў сваёй творчасці быў у абсягу передавых агульначалавечых ідэй, у якіх ён знаходзіў месца беларускай нацыянальнай думцы. Шчасце свайго народа ён бачыў у выхадзе яго на шырокую арэну агульначалавечай гісторыі.

Нарадзіўся Максім у інтэлігентнай сям'і: бацька Адам Ягоравіч – педагог па адукацыі, дэмакрат па перакананнях – усё жыццё прысвяціў вывучэнню культуры і быту народа, вуснай народнай творчасці; маці Марыя Апанасаўна працавала настаўніцай, вельмі любіла літаратуру і нават сама спрабавала пісаць апавяданні.

Рос Максім у сям'і, дзе шмат увагі аддавалася выхаванню дзяцей. Бацька абуджаў у іх жывую цікавасць да прыроды, развіваў назіральнасць, знаёміў з рознымі праявамі жыцця простых людзей, з помнікамі культуры, прывіваў любоў да мастацтва, да прыгожага пісьменства. Вялікае значэнне надаваў бацька развіццю эстэтычных пачуццяў дзяцей. Таму не дзіўна, што ў Максіма вельмі рана абудзілася цікавасць да чытання і кніг. У школьныя гады ён амаль не расставаўся з кнігамі, за што бацька называў яго Максім Кніжнік. Кнігі Максім браў з бацькавай бібліятэкі, дзе, апроч іншых, былі кнігі пра Беларусь, яе гісторыю, зборнікі беларускіх песень і казак. З маленства расла цікавасць Максіма да гісторыі беларускага народа, яго культуры, вуснай народнай творчасці. З гадамі пад уплывам бацькі яна паглыбляецца: ён самастойна вывучае беларускую мову, чытае кнігі па гісторыі Беларусі, этнаграфічныя працы, фальклорныя зборнікі, знаёміцца

Репозиторий ВГУ

з мастацкімі творамі сваіх папярэднікаў. Усё гэта спрыяла таму, што юнак сам пачынае пісаць па-беларуску.

Вельмі рана праявіліся ў Максіма і творчыя здольнасці: ужо ў дзесяць гадоў ён стаў пісаць вершы. Гады вучобы ў Ніжагародскай мужчынскай гімназіі, а пасля ў Яраслаўскім юрыдычным ліцэі з'явіліся надзвычай важным этапам у духоўным і творчым развіцці асобы, сур'ёзнай вучобы, паглыблення ведаў. Сярод вучняў Багдановіч вылучаўся начытанасцю, багатай тэарэтычнай падрыхтоўкай, шырокай эрудыцыяй. Усе сілы і вольны час ён аддаваў літаратуры. Асабліва вабіла яго паэзія славянскіх народаў. Паэт самастойна вывучыў некалькі замежных моў, каб у арыгінале чытаць творы славянскіх і заходнееўрапейскіх пісьменнікаў.

Першае выступленне Максіма Багдановіча ў друку адносіцца да 1907 года, калі на старонках газеты "Наша ніва" з'явілася яго апавяданне "Музыка", што і стала пачаткам літаратурнай дзейнасці. А праз шэсць гадоў выходзіць з друку першы і, на жаль, апошні прыжыццёвы зборнік вершаў пад простай і сціплай назвай "Вянок", які стаў несмяротным помнікам паэтычнага таленту Максіма Багдановіча, помнікам яго грамадзянскага подзвігу.

І стаіць сёння ў скверы насупраць Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь бронзавы паэт – прыгожы ў сваёй паставе, задуменны ў творчым роздуме – непагасная зорка беларускай паэзіі. *(Паводле В. Івашына.)*

6. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Прааналізуйце моўныя асаблівасці тэксту.

Город Минск

Мы восхищаемся сегодняшним Минском. Он поднялся из руин и пожарищ и стал одним из красивейших городов нашей Родины, городом труда, науки, искусства.

Мы любим тебя, Минск, и в тихие сумерки лета, и в дождливые рассветы листопада, в сверкании весенних капелей, и в белом наряде зимы. Ты наш, непокоренный и юный, ты создан нашими руками на века.

Когда над тобой загораются звезды, мы приходим на площадь Победы и долго стоим у негасимого огня. Он, как горячее сердце твоих защитников, вечно горит и бьется, освещая легендарную дорогу бессмертной славы. Мы всматриваемся в творение наших рук и сердец и отчетливо видим свое будущее, видим неповторимые черты родного Минска. *(По С.Граховскому)*

7. Вызначце адрозненне ў лексічным значэнні слоў. Якія формы могуць выкарыстоўвацца без суфіксаў -ір-, -ірава- (-ырава-)? Пры ўжыванні якіх адзінак дапушчаны маўленчыя памылкі?

Фармаваць і фарміраваць, тэлефанаваць і тэлефанізіраваць, газаваць і газіраваць, транспартаваць і транспарціраваць, фармуляваць і фармуліраваць, кваліфікаваць і кваліфіцыраваць, збалансаваць і збалансіраваць, тэставаць і тэсціраваць.

Репозиторий ВГУ

Практычныя заняткі 2
Камунікатыўныя якасці маўлення як тыпалагічныя прыметы правільнай мовы

Пытанні для абмеркавання

1. Як выяўляецца сувязь маўлення з моўнымі і пазамоўнымі структурамі і яе рэалізацыя ў канкрэтных камунікатыўных якасцях?
2. Ахарактарызуйце выяўленчыя сродкі мовы (эпітэт, параўнанне, метафара, алегорыя, увасабленне)
3. У чым выяўляецца нацыянальна-культурная спецыфіка маўленчага этыкету?
4. Гісторыя і сучаснасць беларускага маўленчага этыкету.

Заданні

1. Падрыхтуйце вуснае паведамленне аб чысціні (чыстаце) маўлення. За аснову вазьміце наступнае выказванне Васіля Быкава:

“Гаворачы пра мову, нельга не сказаць тут, што і шэрая, невыразная наша канцылярская мова, мова многіх нашых газет ды часопісаў, – таксама бяда, гэта агульнавядома. Але сёння ўжо можна падумаць: ці неаднолькавай бядой з’яўляюцца абедзве гэтыя крайнасці – пазбаўленае густу і меры захапленне дыялектызмамі, пакарабачанымі, без жаданай патрэбы перайначанымі слоўцамі, моўнымі калекамі і прыдумкамі, таксама як і шэрая казёншчына мовы – яны аднолькава аддаляюць нашу літаратуру ад яе чытача – народа”.

2. У якім кантэксце могуць выкарыстоўвацца наступныя ўстойлівыя выразы? Як яны называюцца?

На пярэднім краі; зрабіць спробу; давесці да ведама; на думку аўтара; у выніку; мець на ўвазе; з мэтай; належны нагляд; у летні перыяд; на належную вышыню; ахапіць мерапрыемствамі; абслугоўванне заказчыкаў, першаступенная задача.

3. Прачытайце тэкст і перакладзіце ўрывак з яго. На аснове атрыманых звестак складзіце характэрныя дыялогі, удзельнікамі якіх могуць быць англічане, амерыканцы, французы, немцы, італьянцы, японцы, лацінаамерыканцы, арабы. Падрыхтуйце паведамленне на тэму "Дзелавы этыкет беларусаў".

В последнее время растет актуальность международных деловых контактов. Поэтому любому руководителю необходимо знать особенности делового этикета и психологии партнеров-иностранцев.

Англичане стремятся избежать категоричности. Любимые выражения англичан – «мне кажется», «я думаю», «я полагаю», «возможно, я не прав».

Их характеризует сложность по возможности избегать однозначных ответов «да» и «нет», что создает иногда трудности в понимании их коммуникативных намерений иностранцами. Сам английский язык идиоматичен, одно слово может иметь много значений, и потому

Репозиторий ВГУ

понимание английской речи, понимание того, что на самом деле хотел сказать англичанин и чего он не хотел сказать, бывает нелёгким делом. Англичанин исключительно вежлив и требует такого же обращения от других, он молчалив, с незнакомыми людьми не вступает в беседу и не обсуждает каких-либо вопросов, он может быть холоден, и его надо «разговорить». В то же время он чуток к намекам, хорошо понимает юмор, но не любит «грязных» шуток и потому иногда осуждает шумные и не слишком приличные немецкие шутки. Существует поговорка: «Молчание – знак согласия». Но для англичан молчание означает именно молчание, нежелание отвечать и больше ничего. Оно не подразумевает согласия с вами.

При установлении и поддержании контактов англичане широко используют подарки (не слишком дорогие, сувенирного характера) и любят сами их получать. Представители крупного бизнеса близки по манерам к аристократии, они ценят утонченные приемы с участием представителей правящей элиты и знаменитых деятелей искусства. Бизнесмены среднего ранга – попроще. Их юмор носит характер больше деловой, профессиональный, увлечения – ближе к интересам среднего класса.

Американцы, как правило, контакты заводят легче, чем англичане, без особых соблюдений правил этикета. Они уделяют большое внимание поискам контактов и сбору посредством их необходимых сведений, а также презентациям и рекламе. В США правила этикета и протокола проще, чем в Англии. Смокинги носят реже, чем в других странах (больше в артистических кругах), фраки – еще реже. Слова mister и mistress на конвертах и в письмах не пишутся; употребляются сокращенные варианты: Mr или Mrs. Написанные полностью, эти слова имеют другой, неприятный смысл. Полностью пишется только Miss. В США распространены рекомендательные ппсьма. Их следует послать по почте, предоставив инициативу запроса письма адресату. Если вы звоните по телефону, назовите свое имя и фамилию (не следует представляться как «мистер» или «мадам»).

Французы при контактах никогда не преуменьшают силу партнера. Они очень внимательны к тому, чтобы сохранить свою независимость и не уступить. Они жестко ведут переговоры и, как правило, не имеют запасной позиции, рассчитывая только на победу. Из национальных черт французских деловых кругов следует отметить такую: они уделяют большое внимание предварительным договоренностям. Французы предпочитают заранее обсудить те или иные деловые вопросы, даже по отдельности, чтобы затем решить вопрос окончательно. Они очень учтивы, вежливы, доброжелательны, склонны к шутке, но при серьезном обсуждении не избегают конфронтацноиного стиля.

И еще две особенности. Во-первых, разнообразие методов и приемов. С одними людьми беседы и контакты могут вестись в элитном тоне, на ту

Репозиторий ВГУ

же тему с другими – в совершенно ином. Во-вторых, между французами очень велики различия как в образовании, культуре, так и в политических взглядах, и расхождения эти растут. Вот почему к каждому собеседнику следует отнестись очень внимательно и, только хорошо узнав партнера, выработать тактику общения с ним. Французы, конечно, менее холодны, чем англичане. Высший слой французского общества чем-то напоминает англичан, а рядовые французы идут на контакты свободно.

Несколько слов о том, как французы вступают в контакты и переговоры. Они значительно более консервативны в этом плане, чем, скажем, немцы или итальянцы.

Во-первых, у них уже вековой опыт – чинопочитание, контакты устанавливаются по званию. Во-вторых, они очень разборчивы в контактах. Вы им нужны – они идут на связь с вами, пропал интерес – сразу отрезали контакт, пропали, как будто вас и не знали. Принцип – никаких лишних контактов. В-третьих, французы не любят приглашать к себе домой. Делают это только в исключительных случаях: или в отношении лиц высокого ранга, или в случае крайней необходимости. Все контакты ведутся, как правило, в рабочие дни и часы. Конец недели, начиная со второй половины пятницы, – только для отдыха, семьи, развлечений. Как и итальянцы, они не очень аккуратны со временем: опоздание для них – обычная вещь. Но если опаздываете вы, они обязательно это заметят. Последнее тем более странно, что они очень вежливы, предупредительны, того же требуют от собеседника и сами очень остро реагируют на любые замечания. Французские деловые круги – истинные патриоты своей страны. В собеседниках, партнерах по бизнесу они ценят знание французской культуры и искусства. Французы эмоциональны, могут перебить собеседника, высказать по ходу беседы критические замечания, но не обижаются, когда перебивают их. О делах французские бизнесмены не любят говорить во время еды (они гурманы), предпочитая вопросы бизнеса обсуждать за кофе. Личных проблем, болезней, доходов, расходов предпочитают не касаться. Приглашение на ужин – большая честь для французов, а опоздание на него на четверть часа считается нормой. На ужин гости приходят с подарком (цветы, но не белые хризантемы, которые во Франции считаются символом скорби; вино дорогих марок, шоколадные конфеты). Устанавливаются контакты главным образом за столом. Недопустимо критиковать еду, а в особенности вино. В больших домах есть свои винные погреба, свои марки, и если вы похвалили вино хозяина, то это может стать первым шагом к установлению добрых отношений (кстати, французы не чокаются).

Во Франции не принято обращаться по имени. Обычно употребляют обращение «мсье» и «мадам». Французы не любят, когда до них

Репозиторий ВГУ

дотрагиваются собеседники. В визитной карточке обычно указывается образование, которое очень ценится.

Немцев отличает хорошая юридическая подготовка, глубокое изучение проблем. На переговорах им свойственна систематичность, они любят обсуждать вопросы последовательно, один за другим. Они очень находчивы, умеют налаживать контакты и высоко ценят установленные связи. Немецкие бизнесмены аккуратны, пунктуальны, имеют огромный опыт в бизнесе и ведении переговоров. Они точны в соблюдении сроков и условий договора и требуют этого от партнеров. Предпочитают, чтобы партнеры обращались к ним с учетом их титулов. Подарки в деловом общении не приняты. На переговорах не тратят попусту время, предпочитая сразу приступить к делу.

Немцы называют титул каждого, с кем разговаривают (г-н президент и т.д.). Если титул собеседника вам неизвестен, обычное обращение – Negr Doctor, замужнюю женщину можно назвать Frau Doctor.

Итальянцы на контакты идут легко, в том числе семейные, домашние. В Италии проявляют особое уважение к детям. Поэтому, здороваясь со знакомыми, сначала справляйтесь о здоровье детей, а затем – о здоровье взрослых.

Итальянские бизнесмены придают большое значение визитным карточкам и ждут, что вы вручите им свою. Переговоры они обычно ведут с людьми, равными им по положению. Итальянцы очень гордятся своей историей и культурой. Знание их, упоминание латинских выражений найдет отзыв у вашего собеседника-итальянца.

Неформальные, дружеские отношения между партнерами приветствуются. Они любят обсуждать деловые вопросы в неофициальной обстановке, в ресторанах, гордятся своей кухней. Еда у итальянцев – предмет культа. За столом могут вестись и самые серьезные переговоры.

Первое, на что обращают внимание иностранцы, сталкиваясь с **японцами**, это их «загадочная улыбка» и искусство скрывать свои мысли. Существует поговорка: на Западе люди говорят вам правду либо лгут. Японцы же никогда не лгут, однако им никогда не придет в голову говорить правду.

Известно, что дипломаты предпочитают не говорить «да» или «нет» и делают это только в крайнем случае. Для японцев произнести «да» и «нет» – далеко не простое дело. Тщательно избегаются также слова «не могу», «не знаю». Данный обычай распространяется и на область деловых отношений. Японцы не склонны выражать свои мысли прямолинейно, а смысл фраз преднамеренно затуманивается оговорками, в которых заложена неопределенность. Из поколения в поколение их приучали говорить обиняками, чтобы уклониться от столкновения мнений, советовали избегать прямых утверждений.

Репозиторий ВГУ

Этика японских бизнесменов значительно отличается от норм делового мира западных стран. Обычно они устанавливают контакты по рекомендации третьих лиц – посредников, услуги которых могут вознаграждаться. Отказ дать визитную карточку может обидеть японца. Контакты устанавливаются с лицами, равными по положению. Тот, кто вступает в контакт с вышестоящим по рангу бизнесменом, выступает в роли просителя.

Японские бизнесмены точно соблюдают назначенное время встреч и болезненно относятся к опозданиям, чем бы они ни были вызваны. В качестве приветствия японцы предпочитают поклоны и избегают рукопожатий – отсюда совет: не протягивай руку первым ни при встрече, ни при расставании.

При переговорах японцы иногда кивают головой – это не означает, что они согласны, они просто хотят сказать, что поняли вас. Японцы очень вежливы и ценят такое же отношение к ним. Бизнесмены не позволяют, чтобы на них давили, они могут даже уйти с переговоров.

В разговорах, контактах с японцами следует иметь в виду еще одну черту – они не терпят ни малейшего оскорбления или грубо сказанного слова и сами воздерживаются от подобных выражений. Вежливость делает их приятными собеседниками. Деликатность ценится японцами превыше всего. И, может быть, еще больше, чем у англичан, у японцев ценится молчание, которое считается категоричнее слов. Все это надо иметь в виду, когда вы устанавливаете контакты с японцами.

Японцы много внимания уделяют тем, с кем устанавливают контакты и ведут переговоры, личностным отношениям с партнерами. С более слабым партнером они могут отойти от своего тактичного обращения и прибегнуть к угрозам. Японцам свойственна аккуратность. Их стиль – обязательность, точность во времени, в исполнении обещаний. Японцы умеют слушать партнера, демонстрируют внимание, поощряя собеседника высказаться, что, однако, отнюдь не следует понимать как знак согласия с вашей точкой зрения.

Латиноамериканцы, как правило, ведут переговоры не спеша, упорно, на практические предложения идут, а если есть финансовые проблемы, материальные затраты, то действуют осторожно.

При заключении двусторонних соглашений тщательно проверяют их соответствие внутреннему законодательству. Беседы ведут обычно один на один. Некоторые латиноамериканцы не всегда обязательны, поэтому желательно соглашение держать под контролем.

Латиноамериканцы экспансивны, дружелюбны. Ярко проявляют свои симпатии. Не очень любят долгие и пустые беседы, предпочитают давать и получать точные ответы. Не склонны выслушивать инструкции, предпочитают живой разговор. Они более открыты, чем западноевропейцы. Этикет по сравнению с принятым в западных странах упрощенный.

Репозиторий ВГУ

Арабы умеют устанавливать контакты, славятся гостеприимством. Пожелание гостя для них закон, но того же они требуют от партнеров, будучи сами гостями. Арабы немного актеры. Когда они не хотят отвечать, то улыбаются, уверяют, что не знают этого вопроса, тянут время или отделываются общими, обтекаемыми фразами.

Для арабов одним из важнейших условий контактов, связей, переговоров является установление доверия. Они стараются не столько предугадать решение проблемы путем анализа событий, сколько извлечь решение из опыта прошлого.

В арабских странах существуют свои нормы этикета, протокола, обычаи, как правило, связанные с образом жизни, религией, идеологией. Их, конечно, надо знать при установлении контактов, при беседах, переговорах, в особенности, если вы едете в арабскую страну. Прежде всего – это отношение к Корану, к мусульманской религии. Не следует допускать никакой критики Корана и, конечно, нужно проявлять уважение к нему. Учитывать то отношение к женщине, которое принято в стране: ни в коем случае не подавать руку женщине. Не подавать ни в коем случае мужчине левую руку для приветствия.

При знакомстве, контакте не рекомендуется расспрашивать о жене, передавать ей приветы, и наоборот: если вы знаете, что у вашего партнера есть дети, нужно расспросить о них, рассказать о своих детях.

У мусульман, арабов не принято употреблять вино и, приглашая на ланч, обед, коктейль, не надо принуждать их пить его. Нельзя подавать к столу свинину *(Паводле часопіса «Секретарь»).*

Модуль 5
НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СПЕЦЫФІКА МОВЫ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

Практычныя заняткі 1
Мова мастацкага твора як сродак спасціжэння нацыянальнай літаратуры

Пытанні для абмеркавання

1. Мастацкія тэксты як рэпрэзентанты нацыянальнай культуры народа, яго карціны свету
2. Нацыянальна-культурная спецыфіка беларускага мастацкага тэксту.
3. Сістэма вобразных сродкаў і нацыянальная ідыяматыка ў мастацкім творы.

Репозиторий ВГУ

4. Моўныя адзінкі ў мастацкім тэксце, якія ўтрымліваюць этнакультурную інфармацыю.

Заданні

1. Раскрыйце тэмы, матывы, вобразы, мастацкія асаблівасці лірыкі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча (творы – на выбар).
2. На прыкладзе твораў Я. Купалы і Я. Коласа пакажыце нацыянальна-культурную спецыфіку беларускага мастацкага тэксту.
3. Прадэманструйце на прыкладах народныя вытокі мовы Я. Купалы і Я. Коласа. Раскрыйце фальклорныя матывы ў тврчасці Я. Купалы і Я. Коласа.
4. Прывядзіце прыклады словатворчасці Я. Купалы і Я. Коласа, узбагачэнне імі слоўніка, фразеалогіі і стылістычных сродкаў беларускай літаратурнай мовы.
5. На аснове твораў класічнай літаратуры пакажыце, як у іх адлюстраваны асаблівасці нацыянальнага светапогляду і менталітэту беларусаў.

Літаратура

1. Гісторыя беларускай літаратуры: XX ст. (20 – 50-я гады) / Пад агул. рэд. М.А. Лазарука, А.А. Семяновіча. – 2-е выд., дапрац. – Мінск, 2000.
2. Мішчанчук, М., Беларуская літаратура XX ст.: Вучэб. дапам. / М. Мішчанчук, І. Шпакоўскі. – Мінск, 2001.
3. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія. У 2 кн. Кн. 1 / уклад. П.М. Лапо [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 944 с.
4. Янка Купала і Якуб Колас у кантэксце славянскіх літаратур. – Мн., 2002.

Практычныя заняткі 2

Мова як фактар існавання беларускай нацыі: рэпрэзентацыя канцэпту ў мастацкай літаратуры

Пытанні для абмеркавання

1. Сувязь мовы і духоўнага жыцця народа.
2. Радзіма як ключавое паняцце ў беларускай літаратуры.
3. Мова як фактар існавання беларускай нацыі: рэпрэзентацыя паняцця ў мове мастацкай літаратуры
4. Выяўленне індывідуальна-аўтарскай карціны свету ў творах патрыятычнай тэматыкі.

Заданні

1. Пабудуйце тэматычны раз з назваў вершаў і пакажыце, як вербалізуецца паняцце *Радзіма* ў творах беларускай літаратуры.
2. Дакажыце, што мастацкі тэкст – крыніца ведаў пра гісторыю Радзімы. Адзен з такіх твораў перакажыце.

Репозиторий ВГУ

3. Назавіце вядомыя вам творы, дзе падаюцца звесткі пра паходжанне назвы Беларусь. Перакажыце гэтыя легенды.

4. Расійскі даследчык С. Р. Варкачоў называе паняцці *Радзіма* і *народ* тэлеаномнымі, г. зн. такімі, якія адлюстроўваюць каштоўнасці, для абароны якіх чалавек гатовы ахвяраваць уласным жыццём. Прывядзіце прыклады мастацкіх твораў, якія пацвярджалі б гэту думку.

5. Вывучце на памяць верш ці ўрывак з празаічнага твора на тэму "Мова – асноўная прыкмета этнасу" (Я. Янішчыц "Мова" , П. Макаль "Роднае слова", М. Танк "З легендаў і казак былых пакаленняў…", Цётка "Шануйце роднае слова", Н. Гілевіч "Адкажы", Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка "Дудка беларуская", У. Караткевіч "Беларуская песня" і інш.)

Літаратура

1. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія. У 2 кн. Кн. 1 / уклад. П.М. Лапо [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 944 с.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. – Мінск, 1999 – 2003.

3. Півавар, К.С. Беларуская ментальнасць у моўнай прасторы мастацкага тэксту / К.С. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 155 с.

Практычныя заняткі 3
Творчасць Уладзіміра Караткевіча.
Лінгвакультуралагічны кампанент у творах У. Караткевіча

Пытанні для абмеркавання

1. Этналінгвістычная адметнасць твораў У. Караткевіча. Мастацкі этнаграфізм у караткевічаўскай прозе.

2. Нацыянальна-культурная спецыфіка лексікі, фразеалагізмаў, прыказак і прымавак. Асноўная роля прыказак і прымавак у творах У. Караткевіча – характарыстыка духоўнага аблічча дзейных асоб, іх поглядаў на навакольны свет ці пэўныя падзеі.

3. Моўныя элементы з нацыянальна-культурным кампанентам значэння ў творах У. Караткевіча.

4. Нацыянальна-культурная спецыфіка анамастычнай лексікі. Антрапонімы як сродак перадачы або гістарычны каларыту ў творчасці У. Караткевіча.

Заданні

1. Пабудуйце лексіка-тэматычныя групы безэквівалентнай і дыялектнай лексікі як носьбітаў этнакультурнай інфармацыі ў мастацкім тэксце У. Караткевіча: найменні страў беларускай кухні, прадметаў і з'яў бытавога характару, назвы казачных і міфалагічных персанажаў, народных абрадаў, танцаў і інш.

Репозиторий ВГУ

2. Пакажыце нацыянальна-культурную адметнасць устарэлай лексікі (архаізмаў, гістарызмаў) у моўнай тканіне караткевічаўскай прозы: грамадска-палітычная і сацыяльна-эканамічная лексіка, назвы зброі, бытавая лексіка.

3. Раскрыйце асаблівасці нацыянальнага іменаслова ў творах У. Караткевіча.

4. Тапонімы як увасабленне геаграфічных і прыродна-кліматычных асаблівасцей Беларусі у творах У. Караткевіча.

5. Прывядзіце прыклады фразеалагізмаў, народных выслоўяў з нацыянальна-культурным кампанентам значэння з твораў У. Караткевіча.

Літаратура

1. Верабей А.А. Абуджаная памяць. Нарыс жыцця і творчасці У.Караткевіча. – Мінск, 1997. – 256 с.

2. Дзядова, А.С. Этналінгвістычная адметнасць рамана У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» на рускую мову / А.С. Дзядова // «Скарына і наш час». IV Міжнар. нав. канф. (2008 г., Гомель). Міжнар. нав. канф. «Скарына і наш час», 13–14 лістапада 2008 г.: у 2 ч. – Ч. 2. – Гомель, 2008. – С. 169–173.

3. Русецкі, А.У. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літ.творчасці / А.У. Русецкі. – Мінск, 1991. – 287 с.

4. Шынкарэнка, В. Нацыянальнае і агульначалавечае ў паэтычнай сістэме Уладзіміра Караткевіча /В. Шынкарэнка // У.Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навук. збор./ Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск, 2000. – С. 53–57.

5. Шкраба, І.Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І.Р. Шкраба. – Мінск, 2008. – 320 с.

Практычныя заняткі 4

Творчасць Васіля Быкава. Адметнасці мастацкай творчасці

Пытанні для абмеркавання

1. Шматпланавасць паказу вайны, зварот да партызанскай тэматыкі ў творчасці В. Быкава.

2. Нацыянальна-культурная спецыфіка мовы арыгінальных твораў В. Быкава.

3. Нацыянальна-маркіраваная лексіка ў быкаўскім арыгінальным тэксце.

Заданні

1. Прывядзіце прыклады нацыянальна-маркіраванай лексікі з твораў В. Быкава. Складзіце тэматычныя рады з найменняў прадметаў і з’яў традыцыйнага беларускага побыту; безэквівалентнай лексікі.

2. Знайдзіце ў творах В. Быкава фразеалагізмы і трапныя народныя выразы, з дапамогай якіх пісьменнік стварае праўдзівую і пераканаўчую карціну жыцця герояў твораў.

Репозиторий ВГУ

3. Прывядзіце прыклады размоўнай і дыялектнай лексікі як сродку стварэння мясцовага каларыту ў аповесцях В. Быкава.

4. Прыказкі і прымаўкі ў мастацкай тканіне быкаўскіх аповесцей. Формулы беларускага маўленчага этыкету, іх нацыянальна-культурная спецыфіка.

5. Знайдзіце ва ўрыўках з твораў В. Быкава традыцыйныя народныя выразы (праклёны і пажаданні). З якой мэтай яны ўжытыя аўтарам?

– А-яй! Гадаўё вы! – дзіка закрычала Дзёмчыха. – Каб вам струцянець да вечара! Каб вашыя вочы груганы паклявалі! Ах, каб вас пярун забіў! [Сотнікаў, с. 144];

…прабурчаў:„Каб цябе, ваўкарэзіна!..” [Воўчая зграя, с. 21];

– Падсуропілі, начальнікі! Ну ладна, трасцу вашай матары! [ВЗг, с. 23];

– От дзякуй, сынок! Хай табе Бог дае здароўечка, – лагодна дзякавала цётка [Сотнікаў, с. 26].

Літаратура

1. Абабурка, М.В. Адметнасці ў стылі і мове твораў В. Быкава: дапаможнік для студ. і настаўнікаў па спец. "Бел. мова і літ."/ М.В. Абабурка. – Магілёў, 2004. – 71 с.

2. Быкаў, В. Праўдай адзінай: літ.крытыка, публіцыстыка, інтэрв’ю / В.У. Быкаў. – Мінск, 1984. – 262 с.

3. Мезенка, Г.М. Беларуская анамастыка: Навуч. дапаможнік для студэнтаў універсітэтаў / Г.М. Мезенка. – Мінск, 1997. – 119 с.

4. Пажарыцкі, М.Б. Мова твораў Васіля Быкава: Лінгвістычна-культуралагічны аналіз / М.Б. Пажарыцкі // Роднае слова. – 2002. – № 1. – С. 41–45.

Практычныя заняткі 5

Нацыянальна-культурная адметнасць творчасці Рыгора Барадуліна

Пытанні для абмеркавання

1. Рэпрэзентацыя асаблівасцей традыцыйнай народнай культуры беларусаў, традыцый і народных матываў у творчасці Рыгора Барадуліна.

2. “Вушацкі словазбор” Р. Барадуліна – слоўнік адметнай лексікі, устойлівых выразаў, параўнанняў, прыказак і прымавак з гаворак Вушаччыны.

3. Значэнне паэтычнай спадчыны Р. Барадуліна для вывучэння нацыянальнай карціны свету беларусаў.

4. Нацыянальна-культурная спецыфіка моўных адзінак у паэзіі Р. Барадуліна. Этнакультурны кампанент мовы ў барадулінскім паэтычным радку.

Заданні

1. Якія факты з біяграфіі Р. Барадуліна пакладзены ў аснову вершаваных радкоў П. Панчанкі:

Репозиторий ВГУ

Ты прыйшоў з вайны і гора,
Ты – з малітвы,
Ты з разгневанага бору,
Ты смалісты.
Сто паэтаў цягнуць хорам,
Ты салістам.
Ты нібы святло ў лесе
Ад каліны,
Ты ад самай добрай песні –
Ад Куліны (*П. Панчанка. Паходжанне майго друга Рыгора Б.*)

2. Раскрыйце этнакультурную семантыку моўных сродкаў у паэзіі Р. Барадуліна, праз якія рэпрэзентуецца паняцце "Радзіма". Прывядзіце прыклады вершаў згаданай тэматыкі. Вывучыце адзін з вершаў на памяць.

3. Складзіце тэматычныя рады побытавай лексікі, ужытай у творах Р. Барадуліна.

4. Прывядзіце прыклады безэквівалентных найменняў з вершаў Р. Барадуліна.

5. Складзіце міні-слоўнікі мовы твораў Р. Барадуліна "Фразеалагічныя і парэміялагічныя адзінкі", "Формулы маўленчага этыкету".

6. **Што азначаюць гэтыя вушацкія прыказкі і прымаўкі? Якія іх іншыя беларускія аналагі вы можаце ўзгадаць?**

Век зжыць – не мех сшыць. Вышэй за лоб не ходзяць вочы. Зарадзіўся сабака з лысінкай, дый і здохніць з ёй. У вар'ята штодня свята. І ігрушкі коцяцца недалёка ад гнілушкі. Ціхая свіння глыбока рыець. Чарачкі ды румачкі давядуць да сумачкі. Праз аднаго барана ўвесь статак паганы. Дурны баран усю чараду збянтэжыць.

7. Адгадайце загадкі, прыведзеныя Р. Барадкліным у сваіх словазборах.

1) Ані шпунта, ані дна – поўна бочачка віна.
2) Падае з гары, а б'е ўнізе.
3) У клубочку сем дзюрачак.
4) Ляціць, крычыць: кум, кум. А сядзець – кроў п'е.

Літаратура

1. Барадулін, Р. Самота паломніцтва: Кніга паэзіі / Р. Барадулін. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 270 с., [1] л. партр.

2. Барадулін, Р. Слаўлю чысты абрус: Выбранае: Для сярэд. і ст. шк. узросту / Р. Барадулін; прадм. А. Астраух. – Мінск: Беларусь, 1996. – 271 с., [1] л. партр.

3. Барадулін, Р. Трэба дома бываць часцей…: Выбр. старонкі лірыкі / Р. Барадулін; прадм. В. Быкава. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 352 с., [1] л. партр.

4. Барадулін, Р., Быкаў В. Калі рукаюцца душы. Паэзія з прозай / Р. Барадулін, В. Быкаў. – Мінск: ГА БТ "Кніга", 2003. – 344 с.: (з іл.).

Репозиторий ВГУ

ЗАДАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ

ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ

1. Беларуская мова як этнакультурны феномен у гісторыі і сучаснасці.
2. Мова як кампанент нацыянальнай самасвядомасці
3. Я.Ф. Карскі як вучоны-славіст, заснавальнік айчыннага мовазнаўства.
4. Францыск Скарына – беларускі першадрукар, асветнік, гуманіст.
5. Роля Ф. Багушэвіча ў фарміраванні і развіцці новай беларускай. літаратурнай мовы.
6. Роля Янкі Купалы і Якуба Коласа ў развіцці беларускай літаратуры і літаратурнай мовы.
7. Тэма гістарычнага мінулага ў сучаснай беларускай прозе.
8. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў сучаснай беларускай прозе.

ПРАКТЫКАВАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ

Практыкаванне 1. Запішыце тэксты, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Ахарактарызуйце простыя сказы:

1. Не даходзячы да лукі выгнуўшыся яшчэ раз каля лесу вельмі прыгожаю дугою Нёман забіраў управа пралёгшы роўнаю бліскучаю стужкаю паміж лугамі і полем. На адным канцы дугі стаялі кучаравыя пышныя хвоі звесіўшы над вадою махрыстыя галіны і аплёўшы пясчаны бераг цэлаю сеткаю смаляных карэнняў. За імі пачыналіся маладыя сакавітыя баравіны перамешаныя са старым лесам. Там-сям з зялёнага мора маладога хвойніку ўзнімаліся верхавіны старых дрэў што як бы аглядалі зялёныя прасторы свае маладое змены цешачыся яе размахам і сакавітай жыццёвасцю. І гэты малады хвойнік і гэты лес і гэтыя хвоі зліваліся ў адную сцяну лесу вырысоўваючы прыгожую лінію паваротаў разгортваючы сваё цёмна-зялёнае крыло і ахопліваючы пясчанае поле дзе раскінуліся маўклівыя пагоркі. А над усім над гэтым ляжала цішыня і спакой раніцы *(Я. Колас).*

2. Сонца не было цяпер такое яркае як раней. Аддаўшы амаль увесь свой пал лету яно берагло рэшткі цяпла грэла мала але на дзіва лагодна і пяшчотна. Гэтай лагоднасцю і пяшчотай было напоўнена ўсё ў прыродзе усе дні. У лагодным сонечным святле гарэлі сумным адвечным полымем ліпы і бярозы каля хат дрэвы ў недалёкім лесе. Як сівізна ад былога ад перажытага бялела ўсюды павуціна. Яна вісела ў паветры абчэплівала павялы і пасохлы бульбоўнік калы і жэрдкі вакол агародаў пажоўклыя кусты. Усё агартаў спакойны стары як свет смутак смутак развітання з цяплом з летам набліжэння слаты халадоў *(І. Мележ).*

3. Чэрвень пышна красаваў на палях. Зеляніна ажно шумела ў росце і на палетках і на ўзмежках і на паплавах і на імшарынах. Кожная былінка

Репозиторий ВГУ

ўпарта цягнулася да сонца. Ясным днём палі пераліваліся квеценню лугавінак шыза-сінімі хвалямі жыта што адкаласавала ўжо і вось-вось закрасуе смарагдавымі колерамі лёну і ячменю млелі ў пяшчоце духмяная парнасць уздымалася ад іх лёгкай смугой калыхалася –дрыжала над зялёным морам. У гэтым моры ледзь прыкметнымі былі постаці палольшчыц на ярыне і трактары што пераворвалі папары і ўздымалі падлесныя балацінкі.

Лета надышло спрыяльнае для ўраджаю цёплае з навальнічнымі дажджамі аднак радавацца за збажыну не было прычын. За прыгажосцю чэрвеньскага росквіту ў полі заўважаліся сляды негаспадарлівых адносін да зямлі, паспешлівасці і абыякавасці ў працы на ёй і гэта абурала да глыбіні душы. Вунь на жытнёвым масіве відаць не засеяныя ўвосень палоскі-агрэхі парослыя пырнікам і лебядой у другім месцы калівы жыта рэдка-рэдка пагойдваюцца сярод гірсы і мятліцы у трэцім як вымакла рунь увесну так і засталася прагаліна там неабвораны бульбяны палетак забуяў разнатраўем у якім патанулі ўсходы бульбы. Хіба можна прайсці міма гэтага з абыякавым сэрцам *(Т. Хадкевіч).*

Практыкаванне 2. Запішыце тэксты, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку, вызначце стыль тэкстаў:

1. Трэба многа вельмі многа ездзіць сябры. Вы маладыя і калі будзеце часта “жыць на колах” шмат хадзіць і падарожнічаць вы паглядзіце многае ў свеце. Але перш за ўсё вам трэба ведаць свой самы прыгожы для нас край. Ездзіце. З экскурсіямі да сваякоў або да сяброў. Вы ўбачыце ўсе канцы нашай мілай ласкавай няяркай краіны якая аднак зачаруе вас сваёй няўлоўнай прыгажосцю. Убачыце гарады і вёскі цёмныя волаты замкаў. І азёры з белымі грабянцамі на сіняй вадзе і старыя каменныя млыны над рэчкамі што зараслі белай лілеяй поўню ў азёрнай вадзе і водсвет яе на мокрай зямлі. Будзеце слухаць музыку нашай пявучай мовы і нашы пяшчотныя песні. І ўбачыце зуброў і аленяў. І галоўнае пазнаеце свой гасцінны добры горды і таленавіты беларускі народ *(І. Караткевіч).*

2. Над ускрайкам лесу дзе пачыналіся жоўтыя пяскі зазвінела песня лясного жаваранка. Ён першы тут вітаў надыход дня і песня расплывалася ў маўклівым паветры звонам тонкага дарагога металу напаўняючы ясна-сінія разлогі надзем'я і глыбокую цішыню зямлі агорнутай затоена-радаснаю задумленасцю. Здавалася усё навокала занямела зачараванае цудоўнымі тонамі песні гэтага вольнага песняра узлескаў і пясчаных пустак між лесу. Снуючыся высока у небе раняла птушка мяккія ласкавыя мелодыі сатканыя са звону срэбраных струн з булькання ясных ручайкоў з зумкання пчаліных крыльцаў шолаху красак. І ўсе гэтыя тоны спляталіся так гарманічна – своеасабліва ў песню лясного жаваранка што яна даходзіла да самых затоеных глыбінь сэрца і калыхала самыя тонкія струны душы. Ніякая іншая птушка нават праслаўлены салавей не можа

Репозиторий ВГУ

параўнацца у спевах з лясным жаваранкам. Толькі свае песні спявае ён у бязлюдных мясцінах дзе рэдка бывае чалавек і мала хто чуе іх. Мелодыя ж спеваў надзвычайна багатая разнастайная дзівосна прыгожая і такая чоткая такая выразная што яе можна палажыць на ноты а мастак-музыка напэўна змог бы выканаць на скрыпцы але афарбоўкі яе тонаў не патрапіць перадаць ніякі музычны інстумент *(Я. Колас).*

3. Усе рэкі Беларусі дужа прыгожыя. Дняпро з высокім правым берагам і неагляднымі далячынямі зарэчных паплавоў паплямаваных дубамі і сінімі люстэркамі старыц. Прыпяць з яе празрыстай цёмнай вадой астравамі пра-токамі і шапкамі буслянак на прырэчных дровах. Дзвіна сціснутая крутымі урвішчамі зарослымі мачтавым лесам. Ласкавы Нёман у воды якога глядзяцца старажытныя вежы і густыя лістоўныя пушчы. Нават невялічкая Шчара са сваімі шлюзамі ў цені неабхватных серабрыстых таполяў. З раптоўным патокам вады што вырываецца са шлюза і выносіць на сабе плыты з людзьмі якія рухава і спрытна працуюць шастамі і бусакамі...

Воблік Беларусі нельга сабе ўявіць без азёр. Іх у нас каля 11 тысяч. Вялікія і малыя цёмныя балотныя і светлыя як самое святло. Лясныя як Кромань або Свіцязь і бязлесныя. Азёры – вочы зямлі. Яны не толькі кормяць навакольны люд але і натхняюць паэтаў *(У. Караткевіч).*

4. Лета для мяне яшчэ там у дзяцінстве назаўсёды прапахла альховай карою з якой мы рабілі лубкі для ягад суніцамі малінаю ды чарніцамі якімі пахлі нашы рукі вусны і нават шапкі у якіх назаўсёды аставаліся пачарнелыя крапінкі ад ягад калі мы траплялі на ягадную паляну а браць болей не было куды добрымі кузаўкамі рабіліся тады гэтыя шапкі а для грыбоў сарочкі з завязанымі рукавамі. Лета пахне для мяне печанымі на кастры каласамі у якіх зерне яшчэ мяккае і салодкае свежым сенам якое яшчэ зусім нядаўна было травою і не паспела ў пунях запыліцца.

Лета гэта ціхая паляна ў лесе уся прагрэтая паўдзённым сонцам…

Лета гэта воз казытлівага непаслухмянага сена збольшага ўвязаны і ўціснуты жэрдзю ехаць жа недалёка неяк давязём.

Лета гэта яшчэ і пах свежай падварушанай зямлі. Ты ідзеш па баразёнцы за акучнікам моцна трымаючы яго за ручкі а твае паабдзіраныя пасунутыя конскімі капытамі ногі радуюцца халаднаватаму мяккаму дотыку зямлі. А зямля ў дзяцінстве лечыць её залепленыя хутка загойваюцца і праколы і парэзы і апёкі…*(Я. Сіпакоў).*

Практыкаванне 3. Устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі і пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку.

1. Дзе б я (ні)быў куды б (ні)закінуў мяне лёс сэр...ца мае заўсёды рвецца ў родную вёску. І (с,ш)чыра прызнаюся што няма для мяне най...часлівейшых хвілін як ехаць да маці да сваіх з...млякоў. Туды дзе кожная пядзя зямлі схо...жана тваімі нагамі дзе з маленства знаёмыя кожнае дрэўца у лес... кожны сіні васілёк і белы рамонак пры дарозе. Як

Репозиторий ВГУ

толькі сы...дзеш з шашы (ад)разу пачынаюц...а нашы землі. Выразна вырысо...ваюцца вёскі (У,у)л...янаўка (М,м)аргі а за (не)вялікім ляском в...сёлым і светлым ад (бела)ногіх бяроз стаіць мая р...дная вёска (С,с)лавінск. Каля лес... ра...кінуўся вялікі палетак кармавога лубін... з церпкім г...ркаватым вод... рам. Ра...цвіў ён на сонцы так хораша што ад яго яркага ж. . .ўтацвет. . . ажно прыжмурваеш вочы. У паветры зв...няць пчолы пры дарозе стракочуць конікі а з поўдн... мяккі вільготны вец...р прыносіць духмяны мядовы вод...р канюшыны. І так хораша робіцца на сэрцы што здаецца (не)ідзеш а нібы ляціш на ветры. У...памінаецца перажытае ўсё да драбніц асабліва б...саногае маленства. Вось тут у Дружбенскім лужку каліс...ці пасвіў коні. Ля Цагельні ў зарасніку бярэзнік... збіраў чырв...нагаловікі у Вілах баравікі.

Асабліва люблю пра...сціся па лузе над рэчкай Морач...у якая аддзяляе (С,с)луцкі ра...н ад (К,к)апыльскага. На гэтым лузе каліс...ці да вайны мой бацька касіў са сваім с...седам Аляксандрам Панічам мурагі. Хоць я тады быў яшчэ зусім малы але помню як аднойчы на (з,с)ходзе за старан...ую працу му...чынам выказалі словы падзякі. З той пары гэтыя мудрыя і харошыя словы з вялікай гордасц...ю і пашанай жывуць у ма...м сэрцы. *(Паводле В. Дайліды.)*

Практыкаванне 4. Устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі і пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку.

Ці мала на свеце цудоўных мясцін?

Давялося мне пабываць усюды. Бываў я на поўдн... і на далёкай поўначы захапляўся (не)разгаданым цудам прыроды паўночным ....зяннем. Ласкавы сонечны поўдз...нь казачныя прасторы (Ч,ч)орнага мора высокія снежныя горы (К,к)аўказа пакінулі (не)забыўны ў...памін аб іх гордай і ветлівай ц...плыні.

Так на свеце вельмі многа прыгожых мясцін добрых людзей ....чырых сяброў. Мабыць (ні)чога лепшага за іх на свеце н...ма. Аднак дзе б я (ні) быў якія б цуды (ні)здз...ўлялі перад маімі вачыма заўсёды ...зяла прамяністае святло роднага мястэчка дзе жылі бацькі і бацькі маіх бацькоў дзе я сам (у)першыню захапіўся ....чодрай со...нечнай прамяністасцю пахам кветак на ша....ковых мурожных лугах спевам жаваранка пад высокімі сінімі н...бёсамі. Вось так і хоча...ца прыгадаць кожны куточ...к кожную сцяжынку у...горачак і лагчынку дзе над люстрам блакітным нашага азярка з...хацяць празрыстыя ....облакі.

(Не)адна навала грозна прашумела над маёй (Р,р)адзімай. Захопнікі колькі разоў агнём і ж...лезам змяталі мястэчка з твар... зямлі. Але і мінулым і сё...няшнім днём яно для мяне самае ветлівае утульнае і (па)свойму прыгожае бо тут пра...шлі мае дзіцячыя гады і юна...тва. Мне здае...ца што тут усё засталося (ня)зме...ным хоць упартыя і доўгія часы зрабілі св...еасаблівыя папраўкі ва ўсім.

Репозиторий ВГУ

Я часта прыяз...жаю сюды ў госці да з...млякоў. Раніцаю калі я...чэ (не)апала раса калі гулкае як буб...н паветра перапоўн...на залатым ...зяннем прамяністага сонца іду я ў шырокія прасторы палёў. *(М. Хведаровіч)*

Практыкаванне 5. Устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі і пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку.

Гэта быў старасве...кі лес. І былі ў ім такія пу...чы і нетры аб якіх (не) ведаў (ні)хто на свеце. Поўны мес...чык раз у чатыры квадры ў...плываў (на) с...рэдзіну неба і а...туль рыхтаваўся пацікаваць што дзе...цца пад паветкаю густога ліс...ця. Але яму ля...чэй было (б) разглядзець што робі...ца пад страхою у хаце ч...лавека чым прабіцца пра... галіны адвечных гу...чароў. І сумаваў тады круглявы блі...часты мес...чык і хаваў свой твар у светлых хмарках. Само яснае сон...йка (ледзь)ледзь прапускала залатыя косы і то толькі (да)палавіны. На самым ніз... заўсёды панаваў ц...нёк і прохаладзь. Звяры і птушкі (не) мелі а...вагі заб...рацца у нетры лес... . Там жыла адна тая Таёмнасць што запаўняла гэтыя нетры страхам і (ні)кому (не) вядомымі дзе...мі.

Праз гу...чары пад павеццю зялёных голек прабівалася бліскучая сту.. .ка халоднай вады і дзяліла пу.. .чу на дзве часткі. Абодв... берагі рэчкі былі густа заро.. .шыя старымі дрэвамі яны прасц...ралі свае га...лё над рэчкаю і лучыліся адны з другімі. І лес па адзін бок рэчкі і лес па другі яе бок быў адным лесам і тое што рабілася на адным беразе рэчкі было таксама справаю другога бераг... .

Рэчка была (не)вялікая у лесе яна пач...налася у лесе і канчалася. Канчалася пышным і прыгожым ...озерам. Вакол ...озера як вежы стаялі мудрыя дрэвы дубы.

(Доўгія)доўгія гады цэлыя вякі жыла пу...ча згодна і ...часліва жыла поўным багатым жы...цём. (*Я. Колас).*

Репозиторий ВГУ

ТЭСТ

А1. Адзначце слова(-ы), напісанне якога(-іх) не супадае з вымаўленнем:

1) зжынаць;
2) скінуць;
3) малацьба;
4) без ласкі;
5) з Іванам;

А2. Адзначце слова(-ы) з асіміляцыйнай мяккасцю зычных:

1) счарнець;
2) зжаліцца;
3) усвядоміць;
4) з бярозы;
5) сляпы.

А3. Адзначце слова(-ы) з падоўжанымі зычнымі:

1) асенні;
2) ссыпаць;
3) карэнне;
4) вяселле;
5) гадзіннік.

А4. Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя з'яўляюцца націскнымі:

1) аб'ін**е**лы, бр**ы**дкі;
2) г**е**незіс, вып**а**дак;
3) дач**ы**ста, ж**а**льба;
4) за**е**чы, натр**у**дзіць;
5) к**а**мбала, **і**кнуць.

А5. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *а*:

1) вер__цяно;
2) поч__рк;
3) выкр__сліць;
4) ц__гельня;
5) п'ед__стал.

А6. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *э*:

1) ас__нсаваць;
2) ц__рымонія;
3) р__кардсмен;
4) антр__соль;
5) ач__рсцвелы.

А7. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *ы*:

1) скр__гатаць;
2) вод__р;
3) пр__вілея;
4) др__васек;
5) пр__зідэнт.

А8. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *е*:

1) камп__нсацыя;
2) ім__ніны;
3) с__ржант;
4) м__лагучны;
5) с__рата.

А9. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *я*:

1) с__мівугольнік;
2) камп__тэнтны;
3) г__рбарый;
4) земл__карыстанне;
5) алімпі__да.

А10. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *і*:

1) зн__навідзець;
2) с__кунда;
3) в__льготны;
4) в__негрэт;
5) акампан__мент.

А11. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *а*:

1) Н__ваполацк;
2) д__ўгалецце;
3) д__ўгатрывалы;
4) д__брасуседскі;
5) бр__немашына.

Репозиторий ВГУ

А12. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара мяккі знак:

1) жэн__шэнь;
2) ц__мяны;
3) ледз__ве;
4) Ул__яна;
5) бул__ён.

А13. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца апостраф:

1) павер__е;
2) трох__ярусны;
3) кампан__ён;
4) жараб__ёўка;
5) адмоў__е.

А14. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *ў*:

1) натары__с;
2) а__каць (у лесе);
3) цікавае шо__;
4) выпукла-__вагнуты;
5) мане__ры.

А15. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца прыстаўная літара:

1) праезд __льготны;
2) па __указцы;
3) __учылішча;
4) па__мкнуцца;
5) Матэ__уш.

А16. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца літара *і*:

1) аб__мшэць;
2) пост__нфарктны;
3) раз__ходзіцца;
4) звыш__мклівы;
5) аб__лгаць.

А17. Вызначыць слова(-ы), у якім(-іх) пішацца вялікая літара:

а) (Б,б)рэсцкія маставыя;
б) (К,к)ошкіна міска;
в) (Г,г)арадскі універсам;
г) Кацярына (Д,д)ругая;
д) (С,с)орасаўская прэмія.

А18. Вызначыць слова(-ы), утворанае(-ыя) прыставачна-суфіксальным спосабам:

а) адмарожанне;
б) змесціва;
в) каварны;
г) паважаць;
д) паштэт.

А19. Вызначыць назоўнікі з канчаткамі –у, -ю ў родным склоне:

1) Сямён, 2) настрой, 3) інстытут, 4) Ульяна,
5) пабег, 6) агарод, 7) універсітэт, 8) гоман.

А20. Вызначыць слова(-ы), якое(-ія) пішуцца разам:

а) мала_душны;
б) контр_удар;
в) паў_горада;
г) глыбока_пасаджаны;
д) хіміка_тэхналагічны.

А21. Адзначыць сказ(-ы) з граматычнымі памылкамі:

а) На стол не паставілі дзвюх талерак з супам.
б) Брэх вялікай сабакі перапалохаў хлопцаў.
в) Барыс не мог заснуць, бо моцны боль у назе не сціхаў.
г) Румяная з марозу, нібы яблыка, дзяўчына хутка ўбегла ў кухню.

А22. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову:

1) смеяться над бездельником;
2) рассуждать о будущем;
3) поехать за дровами;
4) перейти через дорогу;
5) метрах в двадцати.

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

МАРТЫНКЕВІЧ Святлана Васільеўна

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

Метадычныя рэкамендацыі

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Камп'ютарны дызайн *В.Л. Пугач*

Падпісана ў друк 2021. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 3,49. Ул.-выд. арк. 3,16. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўдсюджвальніка друкавых выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014.

Надрукавана на рызографе установы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ